№ 13 (323) 4 красавіка 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Краўчанка ідзе ў прэзыдэнты



«Я ўсё жыцьцё рыхтаваўся да гэтых падзеяў».

старонка 5

### Зьмены ў кодэкс

Новая ініцыятыва групы Парфяновіча.

старонка 3

### Жыцьцё пасьля сьмерці

Лукашэнка загаварыў пра сваю новую амбіцыю.

старонка 4

### Хутка стане горача

Цяплее на 6 км за 10 гадоў.

старонка 12

# 90,4% беларусаў асуджаюць вайну ў Іраку

На замову «Нашай Нівы» сацыялягічная служба агенцыі БелаПАН «Люстра» правяла дасьледаваньне грамадзкае думкі менчукоў. Было апытана 500 чалавек. Пытаньне гучала так: **«Вы падтрымліваеце або не падтрымліваеце ваенныя дзеяньні ЗША супраць Іраку?»**

Як выявілася, **80,8%** жыхароў сталіцы не падтрымліваюць ваеннага ўмяшаньня ЗША ў Іраку. Яшчэ **9,6%** менчукоў «хутчэй не падтрымліваюць, чым падтрымліваюць». Дзеяньні амэрыканцаў падтрымліваюць **3%** апытаных. Яшчэ **2,6%** апытаных «хутчэй падтрымліваюць, чым не падтрымліваюць» дзеяньні ЗША. Такім чынам, усяго 5,6% беларусаў ухваляюць рашэньне амэрыканцаў пра збройнае ўмяшаньне на Блізкім Усходзе. **4%** ня маюць пазыцыі па гэтым пытаньні.

Цікава, што адначасова толькі **7%** лічаць, што Беларусі варта было б даць палітычны прытулак Садаму Хусэйну. **80%** супраць гэтага. Вось жа, беларусы асуджаюць вайну не дзеля сымпатыі да Садама. **На фота: антываенны пэрфоманс анархістаў каля амэрыканскага пасольства.**



IREX-PROMEDIA

### Беларусь зьмякчае тон

**Рэдакцыйны артыкул аўторкавага нумару газэты «Беларусь сегодня» пачынаецца з фразы: «Увесь сьвет хоча… каб амэрыканцам дасталася цяжкая перамога».** Загалоўкі расейскай прэсы ў той жа дзень: «Сьмертаносныя памылкі амэрыканцаў», «Амэрыканцы нясуць калясальныя страты», «Ваенныя няўдачы ЗША», «Амэрыканскія танкі гараць ад расейскіх ракетаў». Старонка 2.

### Вайна ў Іраку вачыма ГРУ?

**«Галоўнае разьведупраўленьне Мінабароны Расеі вядзе сваю ўласную вайну супраць сілаў антыіракцкай кааліцыі. Прычым тэатрам ваенных дзеяньняў абраны Інтэрнэт».** Старонка 7.

АПЫТАНЬНЕ «НН»

# Беларусь і сьвет пасьля Іраку

**ЗША, Вялікабрытанія, Гішпанія і краіны «Новай Эўропы» — супраць Іраку; Францыя, Нямеччына, Расея і Кітай — супраць вайны. Масхадаў падтрымлівае амэрыканцаў, а Лукашэнка вінаваціць Расею ў здрадзе саюзьнікам. ААН імкліва губляе вагу на міжнароднай арэне, Эўразьвяз паралізаваны. Якімі будуць наступствы вайны для міжнароднай палітыкі? Што зьменіцца ў сьвеце і для Беларусі ў выніку Ірацкае вайны?**

**Віталь Сіліцкі, дацэнт Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту:** Выклікае моцны сумнеў думка, якую часта выказваюць аналітыкі: маўляў, разьбяруцца з Іракам — возьмуцца за нас. Гэта нерэальна.

Пасьля вайны Лукашэнку будзе значна лягчэй атрымаць падтрымку Крамля для трэцяга тэрміну свайго прэзыдэнцтва. Калі Пуцін і пачне пратэставаць, дык Лукашэнка зможа заявіць, што той скача пад амэрыканскую дудку.

**Андрэй Фёдараў, эксьпэрт Міжнароднага інстытуту палітычных дасьледаваньняў:** На Беларусь гэтая вайна можа паўплываць толькі ў двух пытаньнях. Па-першае, цэны на нафту. Па-другое, калі знойдзецца «сьлед» беларускага гандлю з Іракам у абыход санкцыяў ААН.

**Мікола Крукоўскі, доктар філязофскіх навук, прафэсар:** Ісламская культура знаходзіцца на ўздыме, перажывае сваё адраджэньне. У гэтым яны блізкія і нам. Гэты канфлікт прымусіць і беларусаў глянуць глыбей на сваю лінію паводзінаў. Раней існавала дзьве лініі: альбо мы ідзём у Расею, альбо — на Захад. Але выяўляецца, што і на Эўропу трэба глядзець уважліва — на гэтай глебе мы свайго Адраджэньня ня зробім. Гледзячы на тое, што адбываецца ў Іраку, мы набяромся больш досьведу, карыснага і для нашага Адраджэньня. Бо ў такія крытычныя моманты, калі стаіць пытаньне «быць ці ня быць», апраўдана ўсё.

**Андрэй Ляховіч, палітоляг:** З гэтай тройкай — Ірак, Іран, Сырыя — даўно трэба было разабрацца. Выніковы вайны будуць няспрыяльнымі для расейскай палітыкі, бо аслабяць уплыў Расеі на той рэгіён. Палітычная вага ЗША павялічыцца, што карысна і для Беларусі: Крэмль будзе мець менш рычагоў для ўплыву на нашу палітыку.

**Валер Булгакаў, галоўны рэдактар часопісу «Arche»:** ЗША паказалі, што цяпер яны маюць шырокі інструмэнтар сродкаў для захаваньня дэмакратыі. З другога боку, выявілася, што ў краінах Захаду няма ўнутранае згоды. Сьвет будзе ўваходзіць у новыя часы моцна мабілізаваны гэткім досьведам. І не ў апошнюю чаргу, мабілізаваны абазначанымі лініямі разлому.

Пра наступствы вайны ў кароткачасовай пэрспэктыве казаць цяжка. Для амэрыканскае эканомікі яны будуць пазытыўнымі.

**Працяг на старонцы 4.**

# Расея і ЗША разыходзяцца, Беларусь зьмякчае тон

**Рэдакцыйны артыкул аўторкавага нумару газэты «Беларусь сегодня» пачынаецца з фразы: «Увесь сьвет хоча … каб амэрыканцам дасталася цяжкая перамога». Загалоўкі расейскай прэсы ў той жа дзень: «Сьмертаносныя памылкі амэрыканцаў», «Амэрыканцы нясуць калясальныя страты», «Ваенныя няўдачы ЗША», «Міт пра дасканалую зброю амэрыканцаў», «Амэрыканскія танкі гараць ад расейскіх ракетаў».**

Іракцы сапраўды змаглі затрымаць амэрыканскія войскі на Эўфраце. Хоць пакуль пра няўдачы можна гаварыць толькі зь вялікай нацяжкай. Вайна яшчэ не набыла татальнага характару, і амэрыканцы самі выбіраюць, дзе і як уступаць у баі.

Калі ў Эўропе проста пануюць антыамэрыканскія настроі, Расея гарыць сапраўдным жаданьнем рэваншу. Гэта тым дзіўнейшае жаданьне, што Расея ніколі не ваявала з Амэрыкай, акрамя як «халоднай вайной». Нlanguздольная зраўнавацца з Амэрыкай па эканамічным ці навуковым патэнцыяле, пабытовай уладкаванасьці, Расея ўсё ж па-ранейшаму бачыць сябе канкурэнткаю ЗША.

Мы назіраем фактычнае адраджэньне рыторыкі часоў «халоднае вайны». Рашэньне пра гэта магло быць прынятае толькі на самым высокім узроўні. Бяз волі Пуціна ў Маскве цяпер нічога на робіцца.

Крытыка з амэрыканскага боку таксама распаляецца. Спачатку ў пастаўках Багдаду радыёэлектронікі і прылад начнога бачаньня Пэнтагон зьвінаваціў асобныя расейскія кампаніі. А празь некалькі дзён уплывовая «Wall Street Journal» зьмясьціла артыкул, які вінаваціць Расею ў падтрымцы іракцкае праграмы па стварэньні хімічнае і бактэрыялягічнае зброі. «Ніхто іншы не зрабіў для ўзнаўленьня садамаўскага арсэналу больш і ніхто так актыўна не спрыяў хаваньню праўды, як Расея, — робіць высновы газэта. — Калі гэтую зброю ўжывуць супраць нашых войскаў ці яна трапіць у рукі тэрарыстаў, Уладзімеру Пуціну, магчыма, ніколі больш не давядзецца атрымаць запрашэньне на тэхаскае ранча спадара Буша-малодшага».

Амэрыканцы не разумеюць: адкуль у Іраку столькі сучаснае зброі ў такім добрым стане пасьля 12 гадоў міжнароднага эмбарга? Яны лічаць, што ўзбраеньні маглі трапіць да Садама з былога СССР праз Сырыю.

На гэтым жа тыдні стала вядома, што Кангрэс ЗША мае апублікаваць інфармацыю пра гэтак званы «прэзыдэнцкі фонд» прэзыдэнта Беларусі, найбліжэйшай саюзьніцы Масквы. Цікава, што сам Лукашэнка гэтым разам імкнецца ўнікнуць сутыкненьня з Вашынгтонам. Нягледзячы на вострую крытыку вайны, ён не аднойчы за апошні месяц адкрыта ці ўскосна заклікаў з павагаю ставіцца да інтарэсаў і вымогаў «такой магутнай дзяржавы, як ЗША», а беларускай дыпляматы загадана нармалізаваць з імі адносіны. Гэты піетэт — яўнае пабойваньне «дактрыны Буша» і імкненьне не дапусьціць прыняцьця «Акту аб дэмакратыі» ў Беларусі, які прывёў бы да новага вітку барацьбы за зьмену рэжыму ў Менску.

Падтрымкаю садамаўскага Іраку праціўнікі Злучаных Штатаў разьлічваюць зьнякровіць ЗША. Але зьнякроўленая Амэрыка можа і ў нос даць. Ня выключана, што Аляксандар Лукашэнка зразумеў гэта першым. «Беларусь сегодня» гаворыць пра «моду на антыамэрыканізм», немагчымасьць адкрытае падтрымкі Амэрыкі з унутрыпалітычных меркаваньняў, рэзка крытыкуе атамную праграму Іраку і Францыю, што дапамагла ў яе рэалізацыі. І заклікае амэрыканскую дыпляматыю «перагледзець свае «базавыя» падыходы ў дачыненьні да іншых краінаў». Ніколі раней афіцыйная прэса не выказвала такое гатоўнасьці адгарнуць новую старонку ў беларуска-амэрыканскіх дачыненьнях.

**Барыс Тумар**

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

# Паралелі

Садам — гэта Сталін. Ваяваць з Садамам — як зь міні-Сталіным. Выступаць за вайну з Садамам — гэта як выступаць за вайну з Сталіным. Рукі прэч ад краіны Саветаў! Або: ня лезь! Яго, як Сталіна, багомяць і баяцца. Калі ён памрэ, Ірак будзе плакаць. Наступнік Садама разьвянчае ягоны культ, але не адпусьціць курдаў. Праз гадоў пяцьдзясят іракцы будуць згадваць Садама добрым словам. Шыіты праз гадоў сорак адкапаюць свае Курапаты. Паэты Садамаві заклікаюць біць бушаўцаў паганых, а народныя хоры пяюць яму гімны. Дывізіі «Хамурапі» і «Навуходаносар» ідуць у бой зь ягоным імем на вуснах, нібы «суворaўцы» і «Аляксандар Неўскі». Бязьлітасны да ворагаў і шарагоўцаў сваёй тыраніі, бясконца шчодры для паплечнікаў і паэтаў — тых, каго пакінуў жывымі, — разумны, як Люцыпар. Ясна: маштаб краіны і эпізод гісторыі ня тыя.

Ці справядліва ваяваць з Сталіным? Ці можна перамагчы ў вайне супраць Сталіна? Гістарычныя паралелі заўжды кульгаюць, але на гэтыя пытаньні кожны мае свой адказ.

**Андрэй Дынько**

# Усходняя Эўропа мае энэргію, якой няма на Захадзе



**Ангела Мэркель, лідэрка хрысьціянскіх дэмакратаў Нямеччыны:** Пашырэньне Эўропы можна трактаваць не як абцяжарваньне Эўразьвязу, а як узмацненьне, як надзея на сьвежы павеў. Краіны, што 50 гадоў ня мелі свабоды, назапасілі патэнцыял энэргіі, якая ў «старой» Эўропы ўжо трохі выветрылася.

Нам шкада, што мірным шляхам раззброіць Садама Хусэйна не атрымалася. Найперш у гэтым вінен ён сам. Тое мірнае раззбраеньне было б рэальным, калі б мы, як заходні сьвет, умелі салідарна цісьнуць на дыктатара. Але калі маем справу з дыктатарам, нельга выключаць у якасьці скрайняга сродку ўжываньне вайсковай сілы.

Мы і ЗША даражым аднымі і тымі ж каштоўнасьцямі, і таму цяпер мы на баку Амэрыкі. Як большасьць людзей сьвету, мы спадзяёмся, што канфлікт хутка скончыцца і ахвяраў будзе як мага менш. Я ўпэўненая, што, на жаль, і ў XXI ст. выкарыстаньне вайсковай сілы застанецца палітычным сродкам.

ШТРЫХ

# Жабы з Кубы

**Беларусь наведаў міністар замежных справаў Кубы Фэліпэ Пэрэс Роке. Перад Менскам ён пабываў у Кіеве. Беларускі візыт быў удвая даўжэйшы проці ўкраінскага.**

Куба — ня першы наш партнэр. Аб'ём двухбаковага гандлю зь ёй у 2002 г. склаў 32 млн. даляраў. Пастаўляем Фідэлю трактары, угнаеньні, вопратку, а ён нам — цукар ды лекі.

Кубінскі міністар ад'яжджаў на радзіму «з пачуцьцём захапленьня тым, як беларускі народ супрацьстаіць вонкаваму ціску». Наўрад ці Ф.П.Роке меў на ўвазе Расею.



БТ адрэагавала на візыт настальгічным рэпартажам — з інтэрвію салдатаў-беларусаў, якіх у часы Карыбскага крызысу перакінулі на Востраў Свабоды, пераапрануўшы сельгасработнікамі. Дыктарка замілавана распавядала пра трапяткое стаўленьне кубінцаў да савецкага войска. «Жабы там такія — пакладзеш у вядро адну, дык болей ня ўлезе. Гэта ў іх далікатэс», — камэнтаваў вэтэран-інтэрнацыяналіст.

**СМ**

# Масхадаў падтрымаў ЗША



Замежны прадстаўнік прэзыдэнта Чачэніі Аслана Масхадава Ахмед Закаеў падтрымаў ЗША і Вялікую Брытанію ў іх вайне з Садамам Хусэйнам. «Чачэнцы лічаць Хусэйна ліхам і для іракскага народу, і для ўсяго ісламскага сьвету», — падкрэсьліў Закаеў у інтэрвію радыёстанцыі «Рэха Масквы». На думку чачэнскага палітыка, Хусэйн «ня ўпісваецца ні ў якія рамкі — ні ў ісламскія нормы і прынцыпы, ні ў сьвецкія». Заява Закаева пацьвердзіла пазыцыю Масхадава па іракцкай праблеме, выказаную праз агенцтва «Чачэн-прэс».

Радзім Гарэцкі

# Твар беларускай інтэлігенцыі


IREX-PROMEDIA

17 студзеня, калі я вяртаўся з пасяджэньня Аргкамітэту па падрыхтоўцы сьвяткаваньня 85-х угодкаў БНР, ля пад'езду майго дому мяне чакаў сіні «Опэль», зь якога непрыкметна выйшлі бандыты і так моцна зьбілі мяне, што я на тры гадзіны страціў прытомнасьць і трапіў у нэўрахірургічнае аддзяленьне бальніцы. Празь некалькі дзён Анатоль Кляшчук рабіў маё фота, якое было зьмешчана ў «НН» з надпісам «Твар беларускай інтэлігенцыі». Мой пабіты твар з сумнымі прыпухлымі вачыма стаў як бы сымбалем беларускай інтэлігенцыі. Я ляжаў у бальніцы і думаў: «Дык які ж сапраўдны твар беларускай інтэлігенцыі?»

Пасьля стварэньня прэзыдэнцкай дзяржавы да большасьці насельніцтва Беларусі, у тым ліку і інтэлігенцыі, пачалі вяртацца тыя якасьці, якія былі тыповымі для бальшавіцка-савецкага часу і ад якіх яшчэ не пасьпелі як мае быць адвучыцца. Гэта перш за ўсё *пачуцьцё страху* — найбольш пашыранае ва ўсім жывёльным сьвеце. А яно вядзе за сабой такія адмоўныя зьявы, як *рабскае паслухмянства, халуйства, падхалімства, дэмагогія, дзьвюхдушша і інш.*

Як прыклад такога паслухмянства, прывяду нядаўнюю сэсію Агульнага сходу НАН, на якой зацьвярджаўся новы Статут. Кіраўнік дзяржавы вырашыў стварыць у Акадэміі чыноўніцкую вэртыкаль і выдаў загад, якім поўнасьцю ліквідаваў выбарнасьць кіроўных пасад прэзыдэнта НАНБ, віцэ-прэзыдэнтаў, галоўнага вучонага сакратара, Прэзыдыюму, людзей на якія ён цяпер прызначае сам. Сяброў Агульнага сходу зацьвярджае таксама ён, а кіраўнікоў установаў НАНБ на кантрактнай аснове прызначае Прэзыдэнт акадэміі. Нават пры Сталіну ў АН не адмянялі выбараў. Камісія па падрыхтоўцы Статуту поўнасьцю ўключыла загад у яго праект. Галасаваньне было ня тайным, а адкрытым, і таму ўсе 394 сябры Агульнага сходу, які, праўда, былі на трацінну разбаўлены прадстаўнікамі неакадэмічных установаў, прагаласавалі «за». Я вельмі зьдзівіўся, калі ўбачыў, што «супраць» толькі я адзін, хоць я добра ведаў, што многія сябры Акадэміі *не падтрымліваюць адмены выбараў* сваіх кіраўнікоў. Цяпер, паводле Статуту, кіраўніком у Акадэміі можа стаць *любы* чыноўнік, нават не вучоны.

На жаль, апазыцыйная частка беларускай інтэлігенцыі вылучаецца, асабліва ў апошні час, многімі хістаньнямі, няпэўнасьцю, вялізнай асабістай ці калектыўнай амбіцыйнасьцю, што прыводзіць да сварак. Яшчэ ў час адраджэньня 20-х гадоў мінулага стагодзьдзя мой дзядзька Максім Гарэцкі сказаў: «Ахвярую сваім "Я" ва імя сьвятога ўсім нам адраджэньня». Зьмены існага цяпер сумна-трагічнага твару беларускай інтэлігенцыі можна дабіцца толькі тады, калі кожны нацыянальна сьвядомы жыхар Беларусі (асабліва зь ліку кіраўнікоў беларускіх партый і рухаў) будзе кіравацца запаветамі нашых адраджэнцаў-папярэднікаў. Толькі аб'яднаньне беларускай інтэлігенцыі можа прывесьці да пабудовы сапраўднай незалежнай дэмакратычнай эўрапейскай дзяржавы, і тады кожны жыхар бяз злога ўдару ў твар падтрымае покліч: «Жыве Беларусь!»

# «Рэспубліка» — за зьмены ў Выбарчым кодэксе

**З наступнага тыдня ў Беларусі пачынаецца новая палітычная кампанія. Дэпутаты групы «Рэспубліка» палаты прадстаўнікоў ініцыююць збор подпісаў за ўнясеньне зьменаў у Выбарчы кодэкс.**

Выбары ў мясцовыя саветы паказалі, што апазыцыя сёньня ня можа ўплываць на фармаваньне выбарчых камісій, кантраляваць датэрміновае галасаваньне, бесьперашкодна назіраць за працэсам галасаваньня і падлікам галасоў. Зараз Беларусь чакаюць парлямэнцкія выбары. Таму і зьявілася ініцыятыва зьмяненьня выбарчага кодэксу.

Дэпутат Уладзімер Парфяновіч кажа, што ў ініцыятараў дастаткова рэсурсаў для ажыцьцяўленьня збору подпісаў. «У нас ёсьць людзі ў кожнай вобласьці, у кожным раёне», — гаворыць ён. Аднак дэталі і пэрсаналіі пакуль не абвяшчаюцца, не называецца й імя каардынатара. Як сказаў У.Парфяновіч, ініцыятыву падтрымалі ўсе партыі і грамадзкія арганізацыі, «за выключэньнем некаторых». Ужо зьбіраецца «сур'ёзная група», якая будзе займацца зборам подпісаў. А іх, каб прапанаваць палаце зьмены ў ВК, трэба 50 тысячаў.

Прапанаваныя зьмены тычацца найперш спосабу фармаваньня выбарчых камісіяў і працы назіральнікаў. Паводле праекту, у камісіі павінны быць дапушчаныя прадстаўнікі ўсіх палітычных партыяў, зарэгістраваных у Беларусі, а назіральнікі павінны «хоць бы бачыць бюлетэні».

Аднак улады ня хочуць ісьці на саступкі ў такім важным пытаньні, як выбары. Таму «рэспубліканцаў» і прадстаўнікоў апазыцыйных колаў чакае цяжкая барацьба. На нядаўнім савеце палаты прадстаўнікоў былы кампартыйны бос Анатоль Малафееў шчыра заявіў: «Ніколі ў жыцьці не дамо зьмяніць выбарчы кодэкс!»

**Алег Тачоны**




IREX-PROMEDIA

# Суд над дысыдэнткай

У тое, што гэтая невысокая абаяльная 29-гадовая жанчына ледзь не дзяржаўная злачынца, проста ня верыцца. Яна трымаецца спакойна і годна — так, мабыць, чакалі судоў савецкія дысыдэнты: дайце нам трыбуну, і мы скажам усю праўду пра вашу ўладу. А.Новікава гатовая гэтаксама ахвярна стаць перад судом, хоць мае яшчэ адзін абавязак — гадуе дзіця.

У Цэнтральным судзе Менску 3 красавіка пачаўся судовы працэс у справе Аксаны Новікавай, абвінавачанай у паклёпе на прэзыдэнта. 17 кастрычніка 2002 г. яе затрымалі каля рэзыдэнцыі падчас раздачы ўлётак, у якіх яна вінаваціла А.Лукашэнку ў захопе ўлады пасьля рэфэрэндуму 1996 г. і крымінальных злачынствах («НН» распавядала пра гэты выпадак у №40 за 2002 г.).

Сьведкамі зь ейнага боку на працэсе пагадзіліся быць Анатоль Лябедзька і Аляксандар Дабравольскі. Юрыдычную падтрымку А.Новікавай аказвае Праваабарончы цэнтар «Вясна».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Спн.Аксана не спадзяецца на апраўдальны прысуд. У сваім звароце да прэсы яна напісала: «Тэарэтычна суд, апраўдаўшы Новікаву, павінен абвінаваціць прэзыдэнта». У размове яна зазначыла, што ўжо адчула ціск: «Суд мусіў пачацца 20 сакавіка, а ў мяне якраз захварэла дзіця. Судзьдзя асабіста затэлефанаваў мне дадому і запатрабаваў, каб я прыехала, інакш мяне арыштуюць. Расповед пра хворае дзіця ня дзейнічаў... Але, відаць, не было яшчэ замовы на арышт — хацелі толькі папалохаць. Пра нейкае аб'ектыўнае разьбіральніцтва няма чаго і казаць: мяне спрабавалі пакараць яшчэ да таго, як пайшоў працэс».

Папярэднія абвінавачваныя ў паклёпе на прэзыдэнта — Мікола Маркевіч, Павал Мажэйка, Віктар Івашкевіч — былі асуджаныя на «хімію». А.Новікава кажа, што ёй такі прысуд не пагражае: «Нават паводле нашых урэзаных законаў мяне ня могуць адправіць на «хімію», бо я маю дзіця да 14 гадоў. Тут можа быць толькі пазбаўленьне волі — альбо рэальнае, альбо з адтэрміноўкай, альбо ўмоўнае».

На думку намесьніка старшыні АГП А.Дабравольскага, суд мусіць стаць унікальнай зьявай у найноўшай гісторыі Беларусі: «Паколькі А.Новікава, як і кожны грамадзянін, карыстаецца прэзумпцыяй невінаватасьці, суду давядзецца даводзіць, што А.Лукашэнка ня мае дачыненьня да тых злачынстваў, пра якія кажа А.Новікава. Я думаю, гэта будзе немагчыма. Ёсьць жа мноства публікацыяў у беларускай і замежнай прэсе, дзе абнародавана багата фактаў».

І А.Новікава, і А.Дабравольскі кажуць, што суд могуць абвясьціць закрытым. Аднак, паводле словаў Дабравольскага, гэта станецца прызнаньнем таго, «што ўладзе ёсьць чаго баяцца».

**Аркадзь Шанскі**

• РЭПЛІКА •

# Хто, калі ня ён?

## У 2006 годзе ў Беларусі будзе новы прэзыдэнт

Зьдзіўляюць размовы пра чарговы (трэці, а фактычна — чацьверты) тэрмін для А.Лукашэнкі. Быццам у Беларусі пануе поўны бандыцкі «беспредел» і не існуе ніякіх законаў, у тым ліку Канстытуцыі.

З гледзішча Канстытуцыі ніякага чарговага тэрміну быць ня можа. Не прадугледжаны. Ніякіх трэціх ці чацьвертых тэрмінаў не прадугледжвае і міжнародная практыка цывілізаваных краін. Гэта значыць, што ўсялякія «дыскусіі» на гэтую тэму супярэчаць Асноўнаму закону краіны.

Натуральна, беларусы могуць некаму нагадваць туркменаў ці паўночных карэйцаў, але, паночку, як ні круці, усё ж такі мы не туркмены і не карэйцы. І кожнаму з нас ужо сёньня ясна, што, пры ўсёй народнай пашане, ППРБ свой палітычны патэнцыял служэньня сінявокай Бацькаўшчыне вычарпаў. Краіна не разьвіваецца і нікуды ня рухаецца. Краіна стаіць на месцы.

Вы скажаце, аўтарытарны кіраўнік, што сканцэнтраваў усю ўладу ў сваіх руках, зробіць так, як яму захочацца, перапіша Канстытуцыю, вынесе яе на рэфэрэндум і народ прагаласуе «за»? Такое сапраўды можа здарыцца, але толькі ў тым выпадку, калі ў людзей ня будзе выбару. Калі дзядзька і цётка на выбарчым участку будуць зноў разводзіць рукамі: «А хто, калі ня ён?»

За мінулыя гады ў нашай краіне цалкам зьліквідаваная публічная палітыка. Яна ўся зьведзеная да аднае асобы. Людзі ня ведаюць ні толькі дэмакратаў, але й самых блізкіх да Лукашэнкі кіраўнікоў. Вось жа, аднаўленьне публічнае палітыкі — гэта адзінае, што можа спыніць размовы пра чарговыя тэрміны і зьвязаны з гэтым чарговы антыканстытуцыйны рэфэрэндум.

Дэмакратычным сілам на выбарах 2006 г. ня трэба будзе шукаць адзінага кандыдата. Ім давядзецца прадставіць цэлы сьпіс вядомых у народзе палітыкаў зь вядомымі і прывабнымі праграмамі. Таму ўжо сёньня людзі мусяць ведаць адказ на сваё пытаньне — хто?

Нашы дэмакраты звычайна спасылаюцца на дзьве аб'ектыўныя перашкоды.

Першая — як данесьці інфармацыю, калі ўсе СМІ ў руках ППРБ? Па-першае, трэба перааддолець у сабе задаўненую грэблівасьць да СМІ, найперш — недзяржаўных. Задача, далібог, вартая гэтай самай грэблівасьці. А СМІ, далібог, зачакаліся пазытыўных палітычных стартаў. Па-другое, чаму ж не выкарыстоўваць і афіцыёзныя выданьні, калі самае важнае, што вы хочаце сказаць людзям, ня тое, што Лукашэнка — кепскі?

Дарэчы, адсутнасьць пазытыўнай праграмы — таксама перашкода, але хутчэй унутраная. Крытыка рэжыму сёньня мусіла б перастварыцца ў лічбы. Скажам, колькі судоў над апазыцыяй прайшло за гэтыя амаль 10 гадоў? Або колькі чалавек зьехалі з краіны па палітычных матывах? Тут хоць той выпадак, калі, як кажуць, адна сьмерць — трагедыя, а тысяча — статыстыка. Сіла статыстыкі — у тым, што яна завяршае гістарычны этап, які ў Беларусі пазначаны імем Лукашэнкі. Усякія «мазаічныя псыхапаты» толькі адштурхнуць людзей. Між іншым, і агітацыя за вайну балаў кандыдатам не прынясе.

Другая перашкода — хто кандыдаты? Калі няма такіх выразных публічных фаварытаў, гэтую місію мусяць выконваць кіраўнікі партыяў ці іхныя намесьнікі. Гаворка ідзе не пра гульню, а пра жыцьцёвае паклiканьне. Прыйшоўшы на рэфэрэндумны ўчастак, людзі павінны ня моўчкі ўкідаць бюлетэні ў таямнічыя скрыні спадарыні Ярмошынай, а жыва дыскутаваць, каторы з кандыдатаў у 2006-м будзе лепшы — Статкевіч, ці Лябедзька, ці Вячорка.

Словам, наўзамен зьнішчанаму полю публічнае палітыкі дэмакратыя мусіла б стварыць новае. Гэта рэальна, калі на сустрэчах у Бешанковічах не рабіць акцэнту на адмаўленьні ці пустаабстрактных развагах пра «Беларусь у Эўропу», а прадстаўляць жывога кандыдата з пазытыўнай праграмай.

Калі дэмакратыя не падрыхтуе такой сытуацыі за кароткія тэрміны, ёй застанецца адно — працягваць спрэчкі пра чарговы тэрмін, тым самым сьцьвярджаючы і прымаючы тое, што ў Беларусі пануе бандыцкі «беспредел» і не існуе ніякіх законаў, у тым ліку Канстытуцыі краіны.

**Сяргей Дубавец**

• ТЫДЗЕНЬ ЖЫЦЬЦЯ •

### Чэмпіёны па пінг-понгу

**Прызначэньне вайскоўца міністрам спорту, здаецца, надало новы стымул для перамог беларускім спартоўцам.** Сьледам за біятляністамі і футбалістамі перамогу атрымала беларуская мужчынская зборная па настольным тэнісе. Хлопцы сталі чэмпіёнамі Эўропы.

### Замест дэпо — прэстыжны квартал

**Тралейбуснае дэпо, што між пр.Скарыны, вул.Кісялёва, Чырвонай і Варвашэні, перанясуць на вул.Гінтаўта, а яго тэрыторыю забудуюць.** На Варвашэні плянуецца ўзвесьці 5—6-павярховыя дамы, на Чырвонай — офісны цэнтар, а таксама кавярні, бутыкі, клюбы. Праект ажыцьцявяць за пяць гадоў.

### Вуліца Генадзя Карпенкі

**АГП зьвярнулася ў Менгарвыканкам з прапановай надаць адной з вуліц яго імя. «На целе Менску шмат шрамаў у выглядзе шыльдаў з прозьвішчамі Мясьнікова, Гамарніка, Будзённага і інш.** Гэтыя людзі ня маюць адносін да Беларусі, дабрабыту і свабоды нашага народу», — гаворыцца ў звароце.

### Каньяк выпіў Дзед Мароз

**Аб'ём вырабу каньяку ў Арменіі ў наступныя два гады істотна скароціцца.** Моцныя маразы загубілі 72% вінаграднікаў краіны.

### Вікy — 75

**28 сакавіка Гансу-Георгу Віку споўнілася 75 гадоў.** Віншаваньні ён прымаў у Бэрліне, дзе цяпер жыве. Былы амбасадар АБСЭ кансультуе нямецкі МЗС, піша мэмуары пра сваю дыпляматычную дзейнасьць, наведвае ўсе імпрэзы ў Нямеччыне, прысьвечаныя Беларусі.

### Лунінецка-бабруйскі крымінал у Нямеччыне

**Два жыхары Лунінца былі арыштаваныя ў Нямеччыне — абрабавалі ювэлірную краму ў Аснабруку (Ніжняя Саксонія).** Іх чакае да 15 гадоў пазбаўленьня волі. За ўзброены напад на банк у Ліхтэнаў (Паўночны Рэйн-Вэстфалія) і крадзеж 10 тыс. эўра арыштаваныя два жыхары Бабруйску. Адзін зь іх выявіўся верхаводам злачыннай групоўкі, якая ў 1995 г. зьдзейсьніла больш за 20 нападаў на нямецкія запраўкі. Тады яму далі 12 гадоў турмы. Пасьля паловы тэрміну дэпартавалі ў Беларусь. А ён ізноў прыехаў.

**СМ; БелаПАН**

# Бацька бачыць сябе Бацькам нацыі

Валер Булгакаў

## Ідэалёгія нацыяналістычнага папулізму

Лукашэнка загаварыў пра сваю новую амбіцыю, гэткі вянок сваёй палітычнай кар'еры. Цяпер ён хоча быць ня проста выбраным хай сабе на дзесяць тэрмінаў прэзыдэнтам. Цяпер ён разглядае сваё прэзыдэнцтва найперш як спосаб закласьці доўгатрывалыя палітычныя традыцыі, якія перажывуць яго. А каб увекавечыць сваё імя на стагодзьдзі, трэба даць неперасягальныя ўзоры рэальнай палітыкі і палітычнага мысьленьня.

У пошуку «ідэалягічных асноваў сувэрэннай незалежнай дзяржавы» Аляксандар Лукашэнка зрабіў экскурс у гісторыю, да Вялікага Княства Літоўскага, Беларускай Народнай Рэспублікі і, нарэшце, да БССР, ад якой, паводле ягоных словаў, і пачынаецца традыцыя нашай дзяржаўнасьці. Ён доўга і падрабязна крытыкаваў беларускі нацыяналізм і нацыяналістаў за тое, што яны праводзяць падзелы ў грамадзтве паводле нацыянальнай і моўнай адзнакі, каб пасьля перайсьці да маштабу ўсяго сьвету й разгледзець тры глябальныя ідэалёгіі — марксізм, кансэрватызм і лібэралізм (марксізм і кансэрватызм у яго разуменьні блізкія беларускай душы, а лібэралізм — бясконца далёкі).

Расія, на думку Лукашэнкі, перастае быць культурным і духоўным узорам, а таксама тэхналягічнай і эканамічнай магутнасьцю. Вінаватымі ў гэтым прызнаюцца эканамічныя рэформы апошняга дзясятка гадоў, калі зьявіліся сыравінавыя алігархі, што несправядліва выкарысталі нацыянальныя расійскія багацьці. Рэзкая ацэнка даецца Расіі і ў сувязі зь яе падрыўной інфармацыйнай актыўнасьцю, якая перашкаджае дасягненьню палітычнай стабільнасьці ў краіне.

Нацыяналізму адраджэнцаў першай паловы 90-х гадоў XX ст. Лукашэнка супрацьстаўляе ўласны нацыяналізм. Праўда, у Лукашэнкавай прамове шмат палітычнае балбатні, якая надае ёй эклектычнасьці і засланяе гэты нацыяналістычны патас. Да таго ж, яна вельмі неаднародная. Частку, нашпігаванаую сухімі навуковымі фармулёўкамі, відаць, пісаў нехта накшталт акадэміка Бабосава, у разьдзеле пра СМІ адчуваецца рука рэдактара Якубовіча, а ў фармулёўках пра Беларусь як духоўную лідэрку ўсходнеэўрапейскай цывілізацыі ўгадваецца стыль Эдуарда Скобелева.

Пэўную частку прамовы складаюць спантанныя выказваньні самога Лукашэнкі, якія руйнуюць стэрэатып пра яго як «ваабшчэ ненармальнага калхозьніка». Лукашэнка, па ўласным прызнаньні, глядзіць «CNN», «Euronews» і «BBC», чытае «Рухнаму» Сапармурата Ніязава ў перакладзе на беларускую мову, слухае скандальную расійскую попгрупу «Тату» і высока ацэньвае ваяцкія здольнасьці чачэнскіх сэпаратыстаў.

Сам факт рэвізіі дзяржаўнай ідэалёгіі паказвае, што на самым палітычным версе зразумелі: ідэалёгія сацыяльнага папулізму, пад сьцягам якой Лукашэнка прамаршаваў першую пяцігодку сваёй прэзыдэнтуры, адпрацавала сваё. Але на зьмену сацыяльнаму папулізму ідзе ідэалёгія, трываласьць якой будзіць ня меншыя пытаньні, — яе можна вызначыць як нацыяналістычны папулізм. Ён будуецца з крутой сумесі асобных элемэнтаў клясычнай нацыяналістычнай дактрыны, каляніяльных культурных комплексаў і традыцыйных вартасьцяў патрыярхальнага грамадзтва. Колькі часу ў галовах вышэйшых урадоўцаў зможа мірна суіснаваць нацыяналістычны міт пра гістарычную абранасьць беларускай нацыі з публічнымі кпінамі зь беларускай мовы, сказаць цяпер ня ўстане ніхто. Але няма сумневу, што й гэтую пачварную мяшанку раней ці пазьней чакае перагляд.

Галоўнае ж, асучасьніваньне дзяржаўнай ідэалёгіі — выразны знак, што пакуль Лукашэнка ні з кім не зьбіраецца дзяліцца сваёй уладай.

Артыкул Валера Булгакава «Новая рэдакцыя лукашэнкаўскай ідэалёгіі» цалкам будзе надрукаваны ў красавіцкім нумары часопісу «Arche»



**Лукашэнка разглядае сваё прэзыдэнцтва найперш як спосаб закласьці доўгатрывалыя палітычныя традыцыі, якія перажывуць яго.**

## Чым Лукашэнка адрозьніваецца ад Атацюрка

«Бацькі-заснавальнікі» Канстытуцыі ЗША, Атацюрк у Турэччыне заклалі ідэалягічны фундамэнт сваіх дзяржаваў на дзесяцігодзьдзі і стагодзьдзі», — заявіў Лукашэнка. Атацюркам — «Бацькам туркаў» у перакладзе — быў празваны Кемаль Мустафа, які зрабіў Турэччыну рэспублікай, мадэрнізаваў і эўрапеізаваў яе (у 1925 і 1930 г. крывава расправіўшыся з працаўнікамі рэформаў), зьмяніў правапіс на лацінку, абмежаваў ролю рэлігіі і перавёў богаслужэньні з арабскай мовы на нацыянальную, турэцкую, зацьменшасьці. Калі б замест эўрапеізацыі і нацыяналізму Атацюрк, як ягоныя папярэднікі-султаны, настойваў на духоўнай непаўторнасьці ўсходнеэўрапейска-асманскае цывілізацыі, Турэччына магла б зьнікнуць, а не шанаваць Атацюрка як бацьку-заснавальніка.

### СТАТЫСТЫКА

**Сьпіс частаты ўжываньня словаў у дакладзе А.Лукашэнкі «Моцная і квітнеючая Беларусь мусіць мець ідэалягічны фундамэнт».**

ідэалёгія 195, дзяржава 157, праца 93, беларус~ы (наз.)/~кі (прым.) 90, я 76, народ 52, Беларусь 39, за 39, краіна 32, грамадз~тва/~дзкі 30, прэзыдэнт 24, саюз 24, моладзь/маладэ 24, культура 22, сьвет 21, эканоміка 19, палітыка 18, Захад 18, рэспубліка 17, Расея 17, лібэралізм 16, нацыянальны 15, падтрымка 13, Ірак 13, Амэрыка 12, супраць 10, незалежнасьць, незалежны 11, камунізм 9, апазыцыя 9, нацыяналізм 8, кансэрватызм 8, усход 8, сьветапогляд 7, урад 6, выбары 6, марксізм-ленінізм 5, кіраўнік дзяржавы 5, ЗША 5, расеец 4, сябар 4, мінулае 4, Эўропа 3, Лукашэнка 3, Масква 2, Буш 2, будучыня 2, рэфэрэндум 2, марксізм 2, рынкавы 1, адзінства 1, вораг 1.

### АПЫТАНЬНЕ «НН»

# Беларусь і сьвет пасьля Іраку

**Працяг са старонкі 1.**

У расейскай — наадварот, выклічуць ускладненьні, бо яна ўся трымаецца на экспарце сыравіны.

Вайна паказала, што Лукашэнка троху баіцца падзеяў: антыамэрыканская рыторыка спалучалася з прызначэньнем Мартынава на пасаду міністра замежных справаў. Пры гэтым адзначалася, што ягонае прызначэньне павінна ўмацаваць заходні вэктар замежнай палітыкі.

Аднак вайна Беларусь моцна не закране. На нас можа адбіцца толькі расейскі эканамічны крызыс. Тады магчымы спад заробкаў і сытуацыя, падобная да той, што склалася падчас расейскага дэфолту ў жніўні 1998 г., калі нацыянальная валюта ў кароткі час стала таньнейшай амаль удвая.

**Ігар Бабкоў, філёзаф:** Сьвет пасьля гэтай вайны ня стане лепшым — больш гуманным, больш свабодным, больш справядлівым. Як бы яна ні скончылася.

Сьвет стане больш рэзкім, больш кантрасным. Ідэі лібэральнай дэмакратыі больш ня будуць асацыявацца выключна з свабодай і дабрабытам. Ад іх будзе пахнуць нафтай і бомбамі. А слова «Захад» ніколі ўжо ня вымавіцца так салодка, як на пачатку 90-х.

У сьвет вернецца гісторыя. Мы зразумеем, што самі адказныя за сваю сучаснасьць і сваю будучыню. Будзе так, як мы зробім, а ня так, як напісана ў Гаека альбо Леніна. Мы пачнём цаніць сваю «неімпэрыялістычную» гісторыю. І зразумеем, што ў сьвеце штодня тысячы паміраюць ад голаду, а ня толькі купляюць «форды» й «фальксвагены» ды запраўляюць найлепшым пральным парашком сваю пральную машыну. Як пра гэта гаворыць тэлевізар.

У гісторыю вернецца альтэрнатыва. Правыя паправеюць, левыя палявеюць. Стане крыху менш ідэалягічных зомбі і проста ідыётаў. А студэнты, як у 80-х гадох — забароненага Ніцшэ, будуць перадаваць адзін аднаму зачытаны ксэракс «Імпэрыялізм як найвышэйшая стадыя (глябальнага) капіталізму».

Пасьля вайны мы ўсе будзем жыць у «Асьвенціме»… Гэта такая кампутарная гульня для выбраных. У ёй пілёт зь бясьпечнай вышыні націскае на гашэтку, і далей ракета сама шукае сваю ахвяру. Пілёт вяртаецца на базу. «Ці ня чуецеся вы вінаватым, — пытаецца журналіст, — ці вы адчуваеце, што там загінулі людзі?» — «Якія людзі, я ня бачыў ніякіх людзей», — дзівіцца пілёт. У яго блакітныя вочы і чыстая дзіцячая ўсьмешка. Як у апошняга чалавека.

**Апытваў Аркадзь Шанскі**

## У Радзе інтэлігенцыі — пераважна пісьменьнікі

**14 дзеячоў навукі і культуры вылучаныя кандыдатамі ў склад Рады беларускай інтэлігенцыі на паседжаньні аргкамітэту Ўсебеларускага сходу інтэлігенцыі 28 сакавіка.** Увойдуць у Раду толькі 9 чалавек. З 14 кандыдатураў — 9 пісьменьнікаў (Сьвятлана Алексіевіч, Вольга Іпатава, Васіль Быкаў, Янка Брыль, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Ніл Гілевіч, Адам Мальдзіс, Алесь Петрашкевіч), кінарэжысэр Юры Хашчавацкі, навукоўцы з галіны гуманітарных і прыродазнаўчых навук Радзім Гарэцкі, Анатоль Грыцкевіч, Генадзь Лыч і Іван Нікітчанка. Сярод кандыдатаў няма ніводнага мэдыка, журналіста, філёзафа.

Урачыстая цырымонія прысягі сяброў Рады мае адбыцца пры канцы красавіка, пасьля абмеркаваньня кандыдатураў.

**МБ**

# Пятро Краўчанка:

**На ідэалягічнай нарадзе Аляксандар Лукашэнка нечакана згадаў Пятра Краўчанку. Маўляў, дыплямат «такое ўтварыў, што ад імпэратара да бамжа ў Японіі ўсе здрыгануліся». Прэзыдэнт актуалізаваў падзабыты ўжо леташні скандал. У адказ Пятро Краўчанка на радыё «Свабода» назваў Аляксандра Лукашэнку «палітычным бамжом Эўропы».**
**«НН» даўно зьвярталася да экс-міністра замежных справаў з просьбай пра інтэрвію. На мінулым тыдні ён нарэшце адказаў згодай. Ад сьнежня 2002 г., калі ён заявіў пра свае прэзыдэнцкія амбіцыі і неабходнасьць стварэньня «новай апазыцыі», былы пасол маўчаў. І вось, нарэшце, загаварыў. У інтэрвію «НН» ён распавядае аб правакацыях супраць яго, пра агентаў КДБ, пра свае сувязі з расейскімі палітычнымі элітамі й пра тое, чаму ён упэўнены ў перамозе на прэзыдэнцкіх выбарах.**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**«У Токіё прыяжджалі правакатары, каб мяне падбухторыць да ўдзелу ў прэзыдэнцкіх выбарах 2001 г. Гэта прадпрымальнікі Б. і С. Пасьля адзін зь іх, афіцэр КДБ у адстаўцы, вылучаўся ў прэзыдэнты Беларусі».**

# «Сцэнар падзей можа быць нечаканым»

**«НН»: Спадару Краўчанка, чаму менавіта цяпер Лукашэнка выступіў з нападкамі на Вас?**

**П.К.:** Лукашэнка лічыць мяне канкурэнтам. Пасьля зьнікненьня вядомых палітыкаў, разгрому апазыцыі, я сапраўды магу скласьці яму канкурэнцыю. Гэта чарговая палітычная правакацыя. Словы Лукашэнкі — абсалютная хлусьня.

**«НН»: У інтэрвію радыё «Свабода» Вы згадвалі нейкую дамову між Вамі і беларускімі ўладамі...**

**П.К.:** Дамовы афіцыйна не існуе. Гэта ў нейкім сэнсе джэнтэльмэнскае пагадненьне, якое яны парушылі.

**«НН»: Лукашэнкаўцы распаўсюджваюць чуткі, што прычынай японскага скандалу была нерухомасьць беларускага пасольства, якую Вы нібыта выкарыстоўвалі не паводле прызначэньня...**

**П.К.:** Абсалютнае глупства. Я вяду судовы працэс з МЗС Беларусі і агенцтвам «Інтэрфакс-Захад». Спачатку прэс-сакратар МЗС Латушка сьцьвярджаў, што Краўчанка зьнік у Токіё з чэкавай кніжкай, афіцыйнымі дакумэнтамі і пячаткай пасольства. Але ў судзе высьветлілася, што ніякай чэкавай кніжкі не існавала. Стала ясна, што гэтыя абвінавачаньні не праходзяць. Вось тады і выступіў Лукашэнка. Ён ужо не сьцьвярджае, што Краўчанка зьнік з чэкавай кніжкай і дакумэнтамі (дарэчы, у пасольстве не было ніводнага дакумэнта з грыфам «сакрэтна»), а гаворыць толькі пра пячатку. Але ім трэба даказаць, што пячатка ў той час не знаходзілася ў сэйфе і што я зьнік на адлегласьць у 200 кілямэтраў. Гэта чарговая хлусьня. Была праведзеная перадача матэрыяльных каштоўнасьцяў, і ўсё сышлося даляр у даляр. Пасол жа ня мае дачыненьня да грашовых сродкаў. Картка ад банкамата, паводле інструкцыі, знаходзіцца ў загадчыцы канцылярыі.

Я вінавачу Лукашэнку ў хлусьні і гатовы вытрымаць яшчэ адзін судовы працэс. Дзякуючы яго заяве стала ясна, хто арганізаваў гэтыя правакацыі супраць мяне. Ці ня дасьць ён яшчэ адно даручэньне спэцслужбам? Тое, што за мной ходзяць віжы, што яны «прывялі» мяне сюды, у рэдакцыю, — гэта факт. Праслухоўваюцца мае тэлефоны, мне пагражаюць. Калі са мной штосьці здарыцца, будзем лічыць, што Лукашэнка даў такое даручэньне.

**«НН»: І калі Вам пачалі пагражаць?**

**П.К.:** Адразу пасьля вяртаньня на Радзіму.

**«НН»: Вы робіце сьмелыя заявы.**

**П.К.:** Калі ідзеш у палітыку, няма чаго баяцца. Я ўсё жыцьцё рыхтаваўся да гэтых падзеяў. Калі будуць пагрозы, буду інфармаваць прэсу. Ёсьць людзі, якія могуць мяне абараніць.

**«НН»: Ці можна сказаць, што прычынай усяму была кніга, якую Вы пісалі і якая зьнікла ў Токіё?**

**П.К.:** Магчыма. Гэта ня кніга, а дзёньнік. Але асноўная прычына — у Токіё я пачаў аднаўляць палітычныя сувязі. Была сустрэча зь Білам Клінтанам. Лукашэнка папросту зайздросьціць. З кім ён сустракаецца? А я перапісваюся з Шымонам Пэрэсам, Джэймзам Бэйкерам, Гансам-Дзітрыхам Геншарам, былым міністрам замежных спраў СССР Аляксандрам Бясьсьмертных. У Японіі я жыў насычаным палітычным жыцьцём, палітычна ўмацоўваўся. Я не паддаваўся на правакацыі, якія былі ў 1998 і 2000 г. У Токіё тады прыяжджалі эмісары-правакатары, што хацелі мяне падбухторыць да ўдзелу ў прэзыдэнцкіх выбарах 2001 г.

**«НН»: Можна назваць прозьвішчы гэтых людзей?**

**П.К.:** Гэта прадпрымальнікі Б. і С. Пасьля адзін зь іх вылучаўся ў прэзыдэнты Беларусі. Ён былы кадравы афіцэр КДБ. Акрамя гэтай правакацыі, была іншая, зьвязаная зь перапіскай, з маім апавяданьнем «Грошы Купалы», якое, я не выключаю, першым прачытаў Лукашэнка. Я перадаваў яго праз аднаго з названых эмісараў на рэцэнзію Максіму Лужаніну. Але мая пасылка «зьнікла» ў Маскве — быццам бы таго чалавека абрабавалі ў гатэлі. А потым, праз тыдзень, яе «вярнулі». Апавяданьне надрукавала газэта «Звязда» 12 жніўня 2000 году.

**«НН»: Чаму Вы не пайшлі на выбары-2001?**

**П.К.:** Тады яшчэ рана было мне вылучацца. Народ быў не падрыхтаваны, як, дарэчы, і цяпер. Але пачынаць раскручвацца трэба за 3—4 гады да выбараў, Ганчарыку не хапіла часу. Таму мяне і правакавалі на фальстарт.

**«НН»: Вас спрабавалі «выціснуць» на Захад?**

**П.К.:** Вядома. Уся гісторыя з зьнікненьнем у Токіё — гэта правакацыя з мэтай прымусіць мяне застацца на Захадзе. Я не спужаўся, прыстойна давёў да канца сваю місію і вярнуўся. А ім вельмі хацелася, каб я затрымаўся яшчэ на некалькі месяцаў, а пасьля зьехаў у ЗША.

**«НН»: У амэрыканскай амбасадзе ў Токіё Вы не былі?**

**П.К.:** Быў, 3 ліпеня 2002 году, на афіцыйным прыёме з нагоды Дня незалежнасьці ЗША.

**«НН»: Калі Вы зьбіраецеся балятавацца ў прэзыдэнты, мусіце мець нейкую каманду. Ці ёсьць ужо яна ў Вас?**

**П.К.:** Над гэтым цяпер працую. Але я думаю, значная частка нашай нацыянальнай інтэлігенцыі, нашых настаўнікаў, мастакоў, пісьменьнікаў, якія добра ведаюць мяне на працягу амаль чвэрці стагодзьдзя, будуць маёй неафіцыйнай камандай. У кожным раёне, кожнай беларускай школцы, музэі, клюбе. Прафэсійна ж каманду буду афармляць, калі прыйдзе час.

**«НН»: Ці прыме Вас апазыцыя?**

**П.К.:** А мне гэтага ня трэба. Я адношу сябе да новай хвалі апазыцыі. Больш зьмястоўнай і памяркоўнай, больш канструктыўнай.

**«НН»: Ужо цяпер гавораць, што за Вамі стаяць нейкія расейскія сілы...**

**П.К.:** Для мяне Расея зьяўляецца прыярытэтам. Я буду гуляць менавіта на гэтым полі. Як дзяржаўнік, чалавек, які цэніць незалежнасьць Беларусі. Але, разам з тым, я — рэаліст. І я спрабую цяпер аднавіць свае ранейшыя адносіны з палітычнай элітай Расеі. Сустракаюся зь яе прадстаўнікамі. Напрыклад, на чэмпіянаце сьвету па футболе ў Японіі была ўся расейская палітычная эліта: ад Жырыноўскага да Хакамады. У гэтай краіне быў і прэзыдэнт Расеі, і практычна ўсе лідэры заходніх краінаў. Я аднавіў свае кантакты на Захадзе і на Ўсходзе.

**«НН»: Улады, напэўна, шкадуюць, што паслалі Вас у Японію?**

**П.К.:** Думаю, так. Яны хацелі б, каб я ператварыўся ў палітычнага маргінала. Ім было б мяне прасьцей вінаваціць у тым, што я «агент Захаду», што атрымліваю гранты. Я ня даў ім для гэтага ніякіх падставаў. Змог сябе палітычна захаваць.

**«НН»: Як Вам удалося паехаць паслом у Японію?**

**П.К.:** Лукашэнка не хацеў мяне туды пасылаць. Але ўсё вырашылі мае добрыя стасункі з расейскімі палітыкамі — Строевым, Селязьнёвым, Прымаковым. Я ў той час быў старшынём камісіі па міжнародных справах беларускага парлямэнту 13-га скліканьня, старшынём камітэту па міжнародных справах парлямэнцкага сходу Беларусі і Расеі. Меў кабінэт у Дзяржаўнай Думе Расеі. І да красавіка 1997 г. пастаянна бываў у Маскве, сустракаўся з палітыкамі, якія і прымусілі Лукашэнку адправіць мяне паслом у Японію.

**«НН»: Што добрага і кепскага зрабіў Лукашэнка для нашай краіны за час свайго кіраваньня?**

**П.К.:** Закладзена значнае палітычнае і эканамічнае адставаньне краіны. Мы ня проста не разьвіваемся, мы пачынаем загніваць. Гэта клясычны застой. Лукашэнка скампрамэтаваў ідэю дзяржаўнасьці. Калі ты сапраўдны дзяржаўнік, ніколі не дазволіш, каб твайго міністра арыштоўвалі перад тэлекамэрамі. Пасьля людзі ня будуць давяраць ніводнаму з тваіх чыноўнікаў. Нельга забыцца і пра сымболіку, мову. У краіне пануе таталітарны, панічны страх. Не хацеў бы адзначаць нейкія станоўчыя рысы праўленьня Лукашэнкі, бо іх я практычна ня бачу.

**«НН»: Ці ёсьць у Вас спадзяваньне, што прэзыдэнцкія выбары будуць справядлівыя і аб'ектыўныя?**

**П.К.:** Няма.

**«НН»: Значыць, Вы гатовыя да паразы?**

**П.К.:** Абсалютна не. Сцэнар падзей можа быць неспадзяваным і нечаканым. Пасьля выбараў 2004 г., калі зноў будуць вялікія парушэньні, на Лукашэнку будзе большы палітычны ціск і з боку Захаду, і з боку Расеі.

**«НН»: Якія Вашыя бліжэйшыя пляны? Ці думаеце ўладкоўвацца на працу?**

**П.К.:** Думаю. Паспрабую ўладкавацца на працу ў бліжэйшы час, хаця гэта зрабіць у Беларусі, як Вы добра разумееце, неверагодна цяжка. Хоць, магчыма, удасца знайсьці яе і тут. Яшчэ адзін варыянт — буду займацца навуковай дзейнасьцю, скончаць працу над доктарскай дысэртацыяй.

**Гутарыў Сяргей Ёрш**

**Шкляная бутэлька — гэта амаль валюта. Яе можна здаць у прыёмны пункт і атрымаць грошы. А плястыкавая бутэлька з 1 красавіка стала нечым адваротным. Яе нікуды не здасі. Затое за яе мы будзем плаціць.**



IREX-PROMEDIA

# Надзея на немцаў

У Беларусі 240 сьметнікаў. Толькі 23% іх адпавядаюць санітарным нормам. Большая частка сьметнікаў выкарыстоўваецца ўжо больш за 15 гадоў, 30% іх забітыя сьмецьцем да краёў. Штогод там знаходзяць вечны супакой 13—15 тыс. тонаў плястыкавых адкідаў. Таму дзяржава вырашыла ўзяцца за ўсе 90 з гакам фірмаў, што пакуюць сваю прадукцыю ў плястмасавую тару. Ім прапанаваны выбар: або за свае грошы перапрацоўваць 30% ад агульнага аб'ёму ўжытай тары, або двойчы на год пералічаць на рахунак Міністэрства прыродных рэсурсаў па 60 базавых адзінак (каля 360 даляраў) за кожную тону адкідаў. Няцяжка падлічыць, што «плястмасавыя» прыбыткі Міністэрства могуць скласьці больш за паўтара мільёна даляраў у год. Сабекошт плястыку падвысіцца, вырастуць цэны на прадукцыю.

## «Дарыда» супраць

1 красавіка, калі пачала дзейнічаць пастанова, абураныя кіраўнікі прадпрыемстваў сабраліся на нараду ў Міністэрстве прыродных рэсурсаў. Найбольш незадаволеныя прыватныя кампаніі. Як паведаміў «НН» прадстаўнік «Дарыды», якая выпускае мінэральную ваду ды газаваныя напоі, пастанова выклікае безьліч пытаньняў: «Сыстэма збору адкідаў не наладжаная. «Дарыда» мае магчымасьць за свой кошт перапрацоўваць плястык, але як зрабіць так, каб туды траплялі скарыстаныя бутэлькі менавіта з-пад нашае, а не з-пад якой іншай мінэралкі?» На «Дарыдзе» лічаць, што колькасьць сьмецьця на вуліцах ня зьменшыцца, а вось за бутэльку газаванай вады давядзецца плаціць рублёў на 100 больш.

## Пераборлівае «Хімвалакно»

«На беларускім рынку перапрацоўкі пайшоў перападзел, — кажа Валеры Кот, дырэктар УП «Белзьнешпрадукт». — Нашая фірма можа ад яго выйграць, калі з намі пачнуць заключаць кантракты на перапрацоўку тары. Самі займацца ўтылізацыяй прадпрыемствы — карыстальнікі плястыкавай тары ня будуць. Большасьць зь іх вырабляе прадукты харчаваньня, а перапрацоўка — гэта бруд, пыл. Аднак выглядае, што прадпрыемствы будуць проста плаціць грошы Міністэрству. Добра, калі яны пойдуць на перапрацоўку сьмецьця, а не на пасяўную».

«Прадаваць перапрацаваны плястык няма куды, — скардзіцца В.Кот. — Нашае прадпрыемства ўжо 7 гадоў перарабляе 6 відаў плястмасавых адкідаў, у тым ліку і ПЭТ-бутэлькі. Мы здольныя перапрацаваць каля 500 тонаў у год, але «Хімвалакно» не жадае набываць нашую прадукцыю».

## Надзея на волата

Чаму ў нас не як у Нямеччыне, дзе розныя віды сьмецьця выкідаюць асобна? «Амаль 70% сьметніц у Менску — нашая прадукцыя, — кажа Сяргей Жук, выканаўчы дырэктар фірмы «Чысты горад». — Аднак спэцыяльных кантэйнэраў для плястыку, паперы, шкла і г.д. няма. Мы прапаноўвалі ўвесьці асобны збор адкідаў, але Менгарвыканкам палічыў задуму стратнай. У сьвеце шпарка разьвіваецца супольная перапрацоўка адкідаў: яны здрабняюцца, а потым апрацоўваюцца з дапамогай фатасынтэзу, рэнтгену і г. д. Займацца гэтым можа буйное прадпрыемства з замежнымі інвэстыцыямі».

І гэта амаль рэальнасьць: нямецкая фірма «Аграгас» пляное збудаваць у Менску першы ў краіне завод па бескіслароднай перапрацоўцы цьвёрдых побытавых адкідаў. Сьмецьце ня будуць паліць, што зьменшыць шкодныя выкіды. Немцы маюць намер укласьці ў будаўніцтва больш за 10 млн. эўра. Але пакуль далей намераў справа не пасунулася.

**Алесь Кудрыцкі**

МЭДЫІ

# «Выбар» быў неасэнсаваны

**У мінулы панядзелак ток-шоў «Выбар» на канале АНТ выйшла з новым вядучым — Ягорам Хрусталёвым. Усяго некалькі месяцаў пратрымаўся ў перадачы філёзаф Уладзімер Мацкевіч.**

«Выбар» стартаваў у пачатку лютага. Шмат высілкаў для гэтага прыклаў палітоляг Уладзімер Мацкевіч і ягоная каманда. Нядаўна кіраўніцтва АНТ адмовілася ад яго паслугаў, без тлумачэньня скасаваўшы кароткатэрміновы кантракт. Далей весьці «Выбар» будзе праграмны дырэктар тэлекампаніі Ягор Хрусталёў. Супрацоўнікі АНТ тлумачаць перамену тым, што Мацкевічу «так і не ўдалося стаць на ТВ прафэсіяналам».

«Я чакаў такога разьвіцьця падзеяў, але ня так хутка, — кажа У.Мацкевіч. — Думаў, што маё запрашэньне на АНТ было асэнсаваным крокам, крокам да дыялёгу з апазыцыяй. І я імкнуўся яго падтрымаць. Але выявілася, што гэтае рашэньне было неасэнсаваным. Праз адсутнасьць сваіх прафэсіяналаў запрасілі таго, хто можа рабіць праграму. І ніякага кроку да дыялёгу не было прадугледжана». Надалей У.Мацкевіч працаваць на тэлевізіі не плянуе.

**СЁ**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## «Слаўнафце» адмовілі

**Расейская кампанія «Слаўнафта» пажадала набыць кантрольны пакет Мазырскага нафтаперапрацоўчага камбінату, аднак урад не пагадзіўся.** 42,7% акцыяў трымае ўрад, 42,5% — «Слаўнафта».

## Чыгунка даражэе

**У 1,33 разу падаражэў праезд на электрычцы.** Цяпер за адну зону давядзецца плаціць 200 рублёў. Плата за праезд па краіне ў пасажырскіх цягніках падвышаная ў 1,15 разу.

## Рачны флёт зробіцца марскім

**Урад зацьвердзіў праграму разьвіцьця воднага транспарту да 2010 г.** Разьвіваць будуць найперш перавозкі па рэках за мяжу. 10 баржаў ды 40 цеплаходаў пераабсталююць, каб вазіць грузы ў мора. Каштаваць гэта будзе 110 млн. рублёў для кожнай баржы і 540 млн. рублёў для цеплахода.

## МАЗ для румынаў

**У румынскім горадзе Канстанца наладзяць зборку гарадзкіх аўтобусаў МАЗ-103.** Менскі аўтазавод падпісаў адпаведнае пагадненьне з румынскай кампаніяй «Дунэра СА». Толькі рухавікі на аўтобусах будуць не беларускімі, а нямецкімі. У Канстанцы ўжо працуюць 120 экспартных беларускіх аўтобусаў.

## Электронны рэзэрв Нацбанку

**Нацбанк набыў абсталяваньне для рэзэрвовага вылічальнага цэнтру, які сёлета пачне працаваць у Менску.** Ён будзе разьмешчаны за 20 км ад асноўнага пляцежна-вылічальнага цэнтру. Штодзённа ў ім адбываюцца плацяжы на больш за 100 млн. даляраў, таму Нацбанк вырашыў перастрахавацца на выпадак тэхнагеннае катастрофы.

**АК**

# Супраць расейскага рубля



IREX-PROMEDIA

**2 красавіка незарэгістраваны Малады фронт зладзіў акцыю супраць увядзеньня ў Беларусі расейскага рубля.** Восем маладафронтаўцаў выйшлі да Нацыянальнага банку. Яны трымалі плякаты, палілі расейскія грошы, скандуючы «Не — расейскаму рублю! Незалежнасьць!». Журналістаў на акцыю зьбіралі канспірацыйна, таму міліцыянтаў не было. Два амапаўцы, якія ішлі па сваіх справах, прачытаўшы ўлётку, рушылі далей.

Скончылася мерапрыемства ў будынку Нацбанку. Маладафронтаўцы перадалі начальніку ўпраўленьня бясьпекі Віктару Ляшкевічу зварот да Пятра Пракаповіча і дамагліся, каб дакумэнт зарэгістравалі. У адсутнасьць Паўла Севярынца, які адседжвае за Дзень Волі, акцыяй упраўнена кіраваў Зьміцер Дашкевіч.

**СЁ**

# Мы будуем капіталізм

Рахунак камунальных паслуг за люты на 14% большы за студзеньскі — нягледзячы на рашучыя заявы зь вельмі высокіх дзяржаўных кабінэтаў. Відаць, мясцовыя выбары не такая важная падзея, каб прыпыніць дзеля яе рэальныя эканамічныя працэсы. Дастаткова папулізму на словах.

Камунальныя плацяжы стабільна ідуць угару і за год павялічыліся ў тры разы. Адначасна імклівa пераводзяцца на грашовую аснову мэдычныя паслугі, зьменшыліся субсыдыі на аздараўленьне, даражэе грамадзкі транспарт. Рынкавы сацыялізм летась стаў нашмат больш рынкавым і нашмат менш сацыялізмам. Адбылося тое з прычыны нягучнай, але плянамернай і мэтаскіраванай дзейнасьці ўладаў.

Урад выконвае **праграму** рынкавых пераўтварэньняў і розьніцца тут ад апазыцыі толькі тым, што ня робіць гэтаму рэклямы. Навошта? Хай народ думае, што пра яго клапоцяцца па-ранейшаму. Толькі ня ўсё, маўляў, атрымліваецца. Так спакайней.

Той факт, што дзеяньні ўлады маюць сыстэмны характар, падазрона часта выпадае з разгляду апазыцыянэраў. Іхная крытыка выглядае так, быццам яны недаацэньваюць урад. «Зноў ня выйшла, зноў ня выйшла!» — чуецца пасьля кожнай інтэграцыйнай сустрэчы. «Таўкуцца на месцы, таўкуцца на месцы!» — пасьля кожнай буйной эканамічнай нарады. Камунальныя рахункі разьбіваюць гэты, па-дзіцячаму наіўны, малюнак.

Праграмы апазыцыйных палітыкаў, з гледзішча шараговага грамадзяніна, прынцыпова ня розьняцца ад урадавай. Яны прапануюць той самы дэмантаж дзяржаўнай сыстэмы сацыяльнай абароны, прыватызацыю прадпрыемстваў, рост няроўнасьці і да т.п. Шмат па якіх пытаньнях існуе ўсеагульны кансэнсус, у які абодва бакі незацікаўленыя прызнавацца.

Адны маскіруюцца папулізмам, скіраваным на настальгічныя пачуцьці старэйшых пакаленьняў, другія ладзяць мерапрыемствы пад расплывістымі лёзунгамі кшталту «За лепшую долю». Няўжо ня варта прызнацца: «Мы будуем капіталізм»? Нельга эксплюатаваць адно толькі пачуцьцё бязадраснае крыўды, якую звыкла запальвае ў душы працоўнага чалавека слова «грошы». Улада яшчэ можа накіроўваць тое пачуцьцё ў патрэбнае рэчышча з дапамогаю гвалту і прымусу. Але іншым палітычным гульцам, калі яны змагаюцца ня толькі за ўладу, але за ідэю, трэба шукаць іншыя спосабы мабілізацыі.

Ня варта хаваць пляны Беларускага Дому ад ягоных будаўнікоў. Тым больш што яны ўсё адно дазнаюцца пра галоўнае — з камунальных рахункаў.

**Аляксандар Карольчык, Гародня**

# Ramzaj

## Вайна ў Іраку вачыма ГРУ?



**Найкруцейшая крыніца інфармацыі пра вайну ў Іраку ў Расеі — не тэленавіны. «Галоўнае разьведупраўленьне Мінабароны Расеі вядзе сваю ўласную вайну супраць сілаў антыірацкай кааліцыі. Прычым тэатрам ваенных дзеяньняў абраны Інтэрнэт». Гэткія інтрыгоўныя анонсы зьявіліся ў інтэрнэт-газэтах.**

19 сакавіка — за 12 гадзінаў да пачатку сухаземнае апэрацыі ў Іраку — у калёнцы хронікі спэцыялізаванага сеціўнага рэсурсу, адкрытага пад вайну, — www.irakwar.ru — зьявілася дзіўнае паведамленьне. Яно звалася «ГРУ ўскрывае элемэнты пляну наступу ЗША». У ім была дэталёва апісаная агульная задума амэрыкана-брытанскага ўварваньня ў Ірак. У прыватнасьці, гаварылася, што ўдар па Басры мае на мэце адцягнуць увагу ды скаваць сілы ірацкае групоўкі, сканцэнтраванай вакол гораду, а асноўны ўдар пойдзе глыбокім ахопам Басры з захаду, праз Насырыю, Амару з выхадам у раён возера Хор-Эс-Савакія і ўтварэньнем вонкавага кола аблогі фасам да Басры. Сьцьвярджалася, што «ад Амары частка групоўкі разаўе наступ уздоўж ракі Эўфрат з выхадам у раён возера Хабанія, захопам гораду Хабанія і стварэньнем перад Багдадам фронту з поўдня і паўахопу з паўднёвага захаду».

Прадказаньні часткова спраўдзіліся. Праўда, бліцкрыгу не адбылося, таму абвергнуць або пацьвердзіць слушнасьць інфармацыі можа хіба толькі лютаваты генэрал Фрэнкс. Таямнічы «ўскрывальнік элемэнтаў пляну» схаваўся за псэўданімам Ramzaj. Кожны новы артыкул Рамзая — а зьяўляюцца яны пару разоў на дзень — выклікаў усё большы ажыятаж інтэрнаўтаў.

### Зьвесткі Рамзая

Большасьць фактаў у зводках Рамзая ўзятыя з адкрытых крыніцаў, што праўда, самых разнастайных і апэратыўна апрацаваных. Рамзай перагортвае і арабскія, і ізраільскія, і ірацкія крыніцы. Масава прысутнічаюць спасылкі на «радыёперахопы», «інфармацыю выведкі». Аўтар апэруе дакладнымі геаграфічнымі назвамі. Ён дасягае амаль эфэкту прысутнасьці на Мэсапатамскай раўніне. Масавыя СМІ ўжо 10 дзён абмяжоўваюцца трыма-чатырма агульназнаёмымі пунктамі: Басра, Багдад, Кіркук. Ён жа наталяе прагу інфармацыі. Ці гарантуецца якасьць? Ён паведаміў пра дадатковую перакідку 120 тыс. амэрыканскіх жаўнераў за два дні да CNN. На 29—30 сакавіка ён прадказваў штурм саюзьнікамі аэрапорту імя Садама Хусэйна ў Багдадзе. Атака не адбылася.

### Аналітыка Рамзая

Рамзай добра арыентуецца ў агульнай тактыцы вядзеньня вайны. «Прынамсі, ён выдатна ведае характар мясцовасьці і ўзбраеньня бакоў, здольны прадказаць стратэгію бакоў», — кажа адзін беларускі афіцэр.

### Сеціўная натура Рамзая

Характар Рамзая нардычны. У адрозьненьне ад Масяні, іншае гераіні Рунэту, разгільдзяйкі і выпівохі, Рамзай піша, нібы пакладзены на клявіятуру ўнутраны голас Штырліца. Ніякіх эмоцый, ніякіх складаных бяззлучнікавых сказаў, ніякіх недагаворак.

### Папулярнасьць Рамзая

Ён лекуе ад комплексу нацыянальнае непаўнавартасьці 10 мільёнаў расейскіх інтэрнаўтаў, нібы вяртаючы іх у атмасфэру піянэрскіх «кніжак пра вайну». З «апэратыўнымі зьвесткамі ў руках» можна паверыць, што яна і ёсьць рэальнасьцю.

### Асяродзьдзе Рамзая

Абрастае тусоўкамі, спараджае моду. На рамзаеўскіх форумах ужо можна знайсьці анэкдоты, кшталту: «Міністэрства замежных справаў Эстоніі ўхваліла тэмпы амэрыканскага наступленьня ў Іраку».

### Згуртаваньне расейцаў сьвету

Воплескі Рамзаю чуваць з розных старон, дзе толькі жывуць расейцы. «Адзіная рэальная крыніца інфармацыі. Перастаў адчуваць сябе зомбі, калі зайшоў сюды». Кожны дзень Рамзай з спасылкамі на зьвесткі радыёперахопу паведамляе пра «як мінімум» 15 забітых салдатаў кааліцыі. Кантакт яшчэ з 400 стр632чаны, некаторыя не выходзілі на сувязь ад першых дзён апэрацыі. Пасьля пясчанай буры ён выклікаў авацыю паведамленьнем, што 70 гелікоптэраў «Апачы» і да 200 танкаў выйшлі з ладу, з прычыны непрыстасаванасьці да ўмоваў пустэльні: пясок забіў рухавікі. «То ли дело российская техника!» — цешыліся чытачы, што актыўна пакідаюць свае меркаваньні на форуме.

### Крытыкі Рамзая

Яны вельмі асьцярожныя. Гэта не Навадворская і нават ня «Яблык». Гэта СПС. Затое ў форумах ласкавых словаў для янкі не шкадуюць. «Толькі б выстаяў Садам!!! Мы тут усе — расейская грамада ў Эўропе — за яго, і нам сорамна за маўчаньне Пуці. Зычу амэрыцы найбольш гадкае паразы». Амэрыка, да якой з сымпатыяй ставілася большасьць расейцаў яшчэ год таму, больш не заслугоўвае нават вялікай літары.

### Куды Рамзай гне

Зьвесткі з тэатру ваенных дзеяньняў (суадносіны забітых — заўсёды каля аднаго амэрыканца на дзесяць іракцаў) перамяжоўваюцца аналізам. Галоўная выснова Рамзая — амэрыканцаў можна перамагаць. Тэхналягічная перавага — нішто ў параўнаньні з «вывучкай жаўнераў, умелым кіраваньнем войскамі й стойкасьцю абаронцаў».

Сьціплы сайт (ангельская і расейская вэрсіі) у інфармацыйнай вайне за Ірак таксама карысны. Бо ж добры вобраз у вачах грамадзкай думкі для кіраўнікоў абодвух бакоў, што ваююць, мае большае значэньне за жыцьці салдатаў.

Дык ГРУ ці ня ГРУ? Гэтае пытаньне жыва цікавіць наведнікаў сайту (іх колькасьць на другім тыдні вайны падскочыла да дзясяткаў тысяч). «Падборкі — супэр! Калі можна, адкуль такая інфармацыя і аналітыка?» — адкрыта пытаецца ў аўтара чытач Werwolf. Адказу ён не атрымае. Даваць адказы гледачам не ў характары Штырліца.

Трэба мець моцную фантазію, каб уявіць, што ГРУ ня мае іншага спосабу інфармаваньня сваіх багдадзкіх сяброў. Ва ўсім праекце зь ягоным якасным дызайнам і высокай апэратыўнасьцю адчуваецца высокая кляса сучасных палітычных тэхналёгій. Але адчуваецца і рука дасьведчанага журналіста-міжнародніка. Міжвольна прыгадваюцца старыя савецкія зводкі з ірана-ірацкага фронту пра «пазыцыйныя баі ў раёне гораду Харэмшэхр».

«Паводле вэрсіі прэсы, за імем Рамзай стаіць ГРУ Міністэрства абароны Расеі. Няўжо не відаць прафэсіяналізму і абазнанасьці?!» — усклікае адзін з фанатаў. «Дзякуй слаўнай Расейскай вайсковай выведцы за падрабязную інфармацыю», — далучаецца другі.

Яркі паліттэхналягічны праект быў бы немагчымы бяз пэўнае падтрымкі спэцслужбаў. Трапляюцца ў ім зьвесткі, якія маглі здабыць толькі яны.

Папулярнасьць чэснага Рамзая — гэта часткова рэакцыя на недахоп інфармацыі з Іраку. Грамадзтва адвыкла ад дэфіцыту зьвестак. Яно хоча ведаць.

Сярэдні расеец — нават высокаадукаваны карыстальнік Інтэрнэту — па-ранейшаму мысьліць утопіямі. Аналягічна думае і мільённая расейская дыяспара ў краінах Усходняй і Цэнтральнай Эўропы, ЗША.

«Эх і добрыя зводкі, дзякуй!» — гэткі водгук сустракаецца ў абмеркаваньні Рамзаевых артыкулаў найчасьцей. Супадзеньне зьвестак з рэчаіснасьцю мала клапоціць аўдыторыю. Яна хоча «толькі добрых навінаў». Гэта значыць — чым болей забітых амэрыканцаў, чым болей ахвяраў сярод мірнага насельніцтва і пажадана яшчэ немінучы абмен хімічна-атамным ударам. Воплескі аўдыторыі кожнай такой зводцы — выразны сыгнал Амэрыцы, што яе папулярнасьць у сьвеце блізкая да рэкордаў віетнамскіх часоў. Рамзай, «Аль-Джазіра» і Садам у добрай згодзе з пацыфістамі куюць перамогу ў інфармацыйнай вайне.

Рэжысэрамі Рамзая могуць быць паліттэхнолягі з атачэньня Пуціна. Рэйтынг «Адзінства» ўпаў ніжэй за мяжу пройгрышу. Палепшыць эканамічную сытуацыю ў бедных рэгіёнах Расеі ня бачыцца магчымасьці, дык хоць пасьпець разбурыць вобраз пуцінцаў як партнэраў Амэрыкі. Сябрам Амэрыкі выбараў у Расеі ня выйграць.

**Франц Субель**

### ЭКСКУРС



**Рамзай** (сапр. Рыхард Зорге) — немец па нацыянальнасьці, працаваў на Савецкі Саюз. Служыў памочнікам нямецкага пасла ў Японіі. 12 траўня 1941 г. Р.Зорге першым паведаміў у Маскву, што агрэсія Германіі супраць СССР прызначана на 20 чэрвеня 1941 г. Прынята меркаваць, што Сталін яму не паверыў. У кастрычніку 1941-га быў выкрыты, прабыў тры гады пад сьледзтвам і быў пакараны сьмерцю.



**Рамзай піша, нібы пакладзены на клявіятуру ўнутраны голас Штырліца. Ніякіх эмоцый, ніякіх складаных бяззлучнікавых сказаў, ніякіх недагаворак. Ва ўсім праекце зь ягоным якасным дызайнам і высокай апэратыўнасьцю адчуваецца высокая кляса сучасных палітычных тэхналёгій. Але адчуваецца і рука дасьведчанага журналіста-міжнародніка.**

## У Інтэрнэце ёсьць усё: 1001 «рамзай»

Інтэрнэт-пошукавік Google прапануе 2170 адсылак на слова «рамзай», напісанае кірыліцай, і толькі 92 адсылкі на слова «ramzaj», набранае лацінкай, як пазначае сябе таямнічы аўтар апэратыўных зводак на irakwar.ru. Легенду па імені «Рамзай» стварыў не гарадок пад Тамбовам і не славуты (у Фінляндыі) фінскі дасьледчык Поўначы, ды нават не шатляндзкі хімік-набэліст Рамсэй, прозьвішча якога расейцы таксама перакладаюць як «Рамзай», а савецкі разьведчык Рыхард Зорге, што ўзяў сабе такі загадкавы псэўданім. Гэта ў яго гонар называецца цяпер буйная расейская гуртова-раздробная гандлёвая сетка — крамы, маркеты, рэстараны і бары.

А сярод 568 адсылак слова «ramzai», набранага ў трохі зьмененым напісаньні, знойдуцца і два нашы айчынныя: гэта, аказваецца, псэўданімы аднаго з удзельнікаў інтэрнэт-форумаў беларускага парталу tut.by і другога (ці таго самага?) наведніка інтэрнэт-асяродку былых «аўганцаў» afganwar.ru.

Сярод адсылак, прапанаваных Google-ам, трапляюцца і годныя нашчадкаў Зорге: «nanado pisatj porussku chto chotscesch uznatj sprosi ramzaj». Канец тэксту.

# Гістарычны выбар Беларусі

**Занёс мяне надоечы нячысьцік на адно дзіўнае «мерапрыемства» — і ўсё ніяк вырашыць не магу, ці на яве тое адбылося.**

...Быццам сяджу я пяць з паловай гадзін і слухаю лекцыю прэзыдэнта. І назва ж такая — «Гістарычны выбар Беларусі». Вось толькі запрашэньне ў руках на мове акупантаў, што гэтую самую незалежнасьць усё «тапілі ў лыжцы вады сваёй» (Янка Купала).

Але сьлёзна было мне, чалавеку нестарому і ў любові да савецкай спадчыны непрымечанаму, асабліва пасьля фразаў накшталт: «Тут некатарыя асабліва нацыяналістычна настроеныя гісторыкі прыдумляюць сабе героічнае мінулае, а я вам скажу, што нас, славян, заваявалі літоўскія фэадалы...», «А ўвогуле, канечне, розьніца паміж Полацкай і астатняй Русьсю была. Ну дык і між брастаўчанамі і магіляўчанамі таксама розьніца ёсьць, дык што, розныя народы?»

Закраналася і моўнае пытаньне: «І гаворыць мне (г.зн. Гаранту Канстытуцыі. — **аўт.**) Валодзя Пуцін: «Дзякуй табе вялікае, што вы ў сябе захавалі дзяржаўны статус нашай мовы!», — а яму ў адказ: «Дык якая ж яна ваша, за што «дзякуй»? Расейская мова — родная нам, беларусам, а ваша — гэта тая, дзе окаюць і якаюць!» Так што пасьпеў Гарант за гэтую лекцыю й новае слова ў лінгвістыцы сказаць.

Была і адвечная песьня пра вызваленьне з-пад «польскага ярма», было і колькі фразаў кшталту: «Пакажыце мне, якія дзяржавы прызналі гэтую вашую БНР, — і я вам паверу...» Нельга забыцца й на пэрлы: «Тут некаторыя ўжо крычаць, маўляў, Сталін быў ну зусім як Гітлер! Жах!», «Трэба яшчэ разабрацца, хто ў тых Курапатах ляжыць. У любым выпадку ясна, што людзі».

Кінуліся ў вочы таксама дыпламатычная выхаванасьць лектара. Распавёў ён, як трэба жыць Эўропе ды Азіі, хто каму што вінен, хто каго на палітычнай арэне баіцца, хто каму плаціць і чым. А ўжо выкшталцонасьцяў на адрас Штатаў — дык у любой іншай краіне МЗС потым з год апраўдвалася б.

«Вытанчаныя» пытаньні маіх калегаў і калякжанак — гэта асобны пункт. Васямнаццаць факультэтаў вырашылі запытацца пра адно і тое ж: «Паважаны А.Р.! Як вы ацэньваеце пэрспэктывы (сёньняшні стан) беларускай...» — далей падстаўляецца: журналістыкі, сацыялёгіі, замежнай палітыкі etc.

Сапраўды цікавыя пытаньні траплялся ў аркушыках. Асабіста мяне больш за ўсё спадабаліся нат не пытаньні кшталту «Калі прэзыдэнт загаворыць па-беларуску?» (адказ: «Беларускую мову я ведаю, бо сам законччыў сельскую школу. А дарэчы (да рэктара), як правільна — «закончыў» ці «скончыў»?»), а зусім караценькае: «Паважаны А.Р.! Калі Вы перастанеце абражаць нашага рэктара, зьвяртаючыся да яго на ты?» Было да болю крыўдна глядзець на выкладчыкаў, што добразычліва ўсьміхаліся, калі да іх зьвярталіся: «...Вашы умныя прафесар**а** мне і гаварат, а я ім...»

Дый студэнты мяне зьдзівілі. Вядома, я не за тое, каб хаміць. Калі паводле пратаколу належыць устаць у прысутнасьці кіраўніка дзяржавы, значыць, трэба ўстаць! Але ў якім пратаколе пазначана, што трэба пляскаць, як аглашэнныя, з кожнага глупства й зьзяць такой радасьцю, нібы атрымалі запрашэньне ў Парыж на Каляды.

**Летуценны палескі студэнт,
што таксама там быў,
але Лукашэнка яму зусім
не спадабаўся**

# За выжываньне

**Яшчэ пару гадоў таму ў апазыцыйных колах была папулярнай тэза, што народ беларускі дурны, як варона.** Лаючы народ, багата хто расьпісваўся ў нязьдатнасьці перакапаць, перацягнуць на свой *слушны бок* хоць бы троху значнейшую частку суграмадзян. Рэжым з таго толькі пацяшаўся.

Тэза гэтая практычна больш не агучваецца, нават у гутарках за чаркай і скваркай. Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001-га пачалося прасьвятленьне: ня трэба быць гэтакай элітай з канапель, а трэба справамі, лепшымі дзеямі давесьці сваю элітарнасьць. Прасьветлеўшы, грамадзкія арганізацыі ажно са скуры вылузваліся сталі, абы *зрабіць лепш* і распавесьці пра гэта *народу*. Народ, можа, і чуе нешта, але надта заняты сваімі пільнымі праблемамі. Людзі перажываюць шок ад тых павеваў, што ідуць з уладнае гары.

Зь цяжкой галавой даводзіцца разумець, што вяртаньня ў машэраўскі сацыялізм ужо ніколі не адбудзецца. Вэртыкальшчыкі, зьбіраючы пэдагогаў, плачуцца ў камізэльку: ня ведаюць, як народу бязболесна патлумачыць, што беларуская дзяржава будуе *капіталізм*. А тлумачыць нічога й ня трэба. Люд даўно стаў прыходзіць да адпаведных высноваў. Бабулькі зь семкамі, арэшкамі ды іншай трасцай на вуліцах не ў імя сацыялістычных ідэй стаяць і ў дождж і ў сьнег.

Паслухайце, яны гавораць пра барацьбу за выжываньне. Нашыя мільёны разоў згаданыя пэнсіянэры цытуюць з аднолькавым посьпехам Біблію і Дэйла Карнэгі. Зь іх нельга кпіць. Іх нельга называць хамамі ці быдлам. Яны мудрэйшыя за многіх палітыкаў. Яны вымушаныя на старасьці змагацца за выжываньне. Але тыя, хто заняпаў, занядбаў сябе, маючы здароўе й сілы, жалю й спачуваньня ня вартыя. Гэта яны прыўносяць смурод і бруд у грамадзкія месцы. Гэта яны пыхаюць агрэсіяй, думаючы, што апранацца ахайна й чыста могуць толькі бандыты. Яны пераказваюць-згадваюць штосьці брыдка сталінска-брэжнеўскае. Страшна, што іх па-ранейшаму болей, хоць ужо й ненамнога. Барацьба за выжываньне.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

PROMENADE

# З санаторыі на Нарачы

**Ня ведаю, як каму, а для мяне няма лепшага задавальненьня, як марозным днём, лежачы на канапе ў цёплым нумары прынарачанскай санаторыі, чытаць сьвежы нумар «НН».** Але ж рана ці позна ты не прачытаеш аж да купона бясплатнай абвесткі, а калі ня п'еш гарэлкі ды кабетамі не цікавішся, апроч адной, што засталася ў Менску, дык у нядзелю асабліва й заняцца няма чым, акрамя шпацыру па лесе. Таму й вырашыў далучыцца да купкі адпачынкоўцаў, пераважна пэнсіянэраў, што выпраўляліся ў Мядзел у так званы «Музэй народнай славы», а іншым словам — мясцовы краязнаўчы музэй.

Сустрэлі нас сьцены, упрыгожаныя цытатамі з Маркса, Леніна і нават пленумаў ЦК КПСС. З стэндаў наведнікам распавядаецца, як у XIII ст. нейкія літоўскія князі гвалтам падпарадкавалі заходнярускія землі, скарыстаўшыся зь іх разьяднанасьці. Альбо пра нейкае ўзьяднаньне, што адбылося на нашай зямлі пры канцы XVIII ст.

Адна заля паводле даўняй савецкай завядзёнкі прысьвечана дэлегатам, дэпутатам ды іншым знакамітасьцям нарачанскай зямлі гэткага кшталту. На паліцах раскладзены ўзнагароды, граматы, пасьведчаньні, фатаграфіі з усялякіх зьездаў. Але ж час не стаіць на месцы, таму ў гэтай жа залі зьмешчана вялікая экспазыцыя, складзеная з абразоў ды прадметаў культу, у тым ліку скнфіскаваных беларускімі мытнікамі ды перададзеных музэю.

Матка Боская ды Эзус сумна пазіраюць праз шкло на сярпаста-малаткастае дабро тых, што лічылі сябе багачамі зямнымі...

**Вячка Васілёнак, Нарач**

# З Койданава

**Працую прыбіральшчыцай у краме за 40 тысяч, зь вялікім намаганьнем пераношу зьдзек і гвалт.** Ня ведаю, ці стане мяне надоўга. Пайшла ў наш гісторыка-краязнаўчы музэй прасіць, каб зрабілі выставу да дня памяці Каруся Каганца 20 траўня. Папыталіся, які гэта месяц — травень. Але ўсё ж сышліся на тым, што зробяць хоць з школьнікамі. А ў бібліятэцы зробяць «досье» на Каганца. Занесла ім яшчэ разанаўскую «Крыніцу» з падборам па Каганцу. Яны зрабілі ксэракопію на 22 старонкі, падзякавалі мне, бо «Крыніцы» ў іх, вядома ж, не было. Такая вось праца...

Заходзіць у краму Леанід Ермаловіч, захавальнік школьнага музэю ў Навасёлках па Каганцовай спадчыне (21 ліпеня яму будзе 80 гадоў), просіцца па-беларуску прынесці бутэлькі і паглядае на мяне. Крамніцы яму адказваюць зьдзекліва, што прымуць бутэлькі «зь первымі цьвяточкамі». Леанід перапытвае: «Зь якімі кветкамі? Я стары ўжо, дык ня чую».

А я настолькі бясправўная, што нават тых бутэлек не памагу яму здаць. Ведаю, сама столькі паперацягала на сваім карку: і бутэлек, і анучаў, і слоікаў, і бульбы... Эх, няма мужчынаў у нашым Краі! Выбачайце, выбачайце, нагаварылася...

**Ганна Суднік,
Койданава**

КАЛЯНДАР

# Асьлеплены сонцам

«Вінцэнт Вілем Ван Гог нарадзіўся ў Грот Зюндэрт (Галяндыя) 30 сакавіка 1853. Памёр у Авэр-сюр-Уаз (Францыя) 29 ліпеня 1890». За гэтымі лякалічнымі радкамі на магільнай пліце — усё жыцьцё чалавека, які марыў стаць пастарам-кальвіністам, як ягоныя дзед і бацька, а стаў мастаком-бадзягам. Паміж сумненьнямі і неразуменьня, бядотаў і хваробаў, адзіноты і вар'яцтва галоўным у нядоўгім жыцьці Ван Гога стаўся жывапіс. Зь ягоный дапамогаю і дзеля яго ён змагаўся супраць усіх і супраць самога сябе.



Ван Гог. Аўтапартрэт з адрэзаным вухам, 1889.

Беларускія выдаўцы выпусьцілі ў сярэдзіне 90-х мінулага стагодзьдзя грунтоўны ліцэнзійны альбом Г.Грутроя «Ван Гог. Творчы шлях мастака» і важкі том прозы — славутыя «Лісты да брата».

А хто з нас не зачытваўся раманізаванымі біяграфіямі «Жыцьцё Ван Гога» француза Анры Пэрушо і «Прага жыцьця» амэрыканца Ірвінга Стоўна? Хто ня памятае адначменнай галівудзкай экранізацыі Вісэнтэ Мінэлі? Гэты кінафільм не расчараваў, бо ўспрымаўся ня горш за літаратурную першакрыніцу.

Існуе і беларускі фільм пра Ван Гога. Зьнялі дакумэнтальную стужку мастакі, і галоўную ролю выканаў мастак Міхаіл Нацэўскі. Фільм разасланы да ўдзелу ў прэстыжных эўрапейскіх кінафэстывалях.

Летась у Менску на вуліцы Надзеждзінскай адбыўся пэрформанс «Дом-музэй Вінцэнта Ван Гога», а ў галерэі «Жыльбел» чатыры жывапісцы прадставілі праект «Партрэт Нацэўскага М. і адно ягонае палатно». Палатном тым, як своеасаблівай парафразаю і данінай павагі Ван Гогу, былі «Сланечнікі».

Багата параллеляў можна правесьці між Ван Гогам і Язэпам Драздовічам. Згадайма іхні вандроўны лад жыцьця, непрытульнасьць і пабытавую неўладкаванасьць, адсутнасьць сям'і, адыход у іншы сьвет непрызнанымі, літаратурныя заняткі, прагную цікавасьць да зораў і плянэт.

Можна знайсьці шмат цікавых супастаўленьняў у матывах, настроях і плястыцы Ван Гога і такіх непадобных да яго жывапіснай манерою мастакоў, як Пётра Сергіевіч, Міхась Сяўрук і Міхась Рагалевіч. Мала знойдзецца жывапісцаў, якія не прастойвалі б у музэйных залях перад «Чырвонымі вінаграднікамі ў Арлі» або перад «Краявідам у Авэры пасьля дажджу»! Мала хто ў студэнцтве не «закасіў пад Вінцэнта» хоць парутройку палотнаў.

Згадайма яшчэ раз добрым словам вялікага галяндца! А хто хоча і мае — няхай выкуліць пад адпаведную кампазіцыю з «Крамбамбулі» кілішак абсэнту, які дужа шанаваў Вінцэнт.

**Уладзімер Сіўчыкаў**



**У.Сіўчыкаў. Дачка Хрысьціна ў вобразе La Mousmé, мадэлькі Ван Гога. Папера, аловак.**

# Што нясе нам пацяпленьне


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**«Езьдзіце ў СССР. Іначай ён сам да вас прыедзе», — сумна пасьміхаліся ў краінах Варшаўскага блёку ў 1970-я. Зь цягам часу жарцік з палітычнага зрабіўся кліматычным. Вандроўка ў «цёплыя краіны», падарожжа «на поўдзень» — мара ці абавязковая праграма летняга адпачынку кожнай сям'і. Тым часам пацяпленьне само рухаецца нам насустрач з хуткасьцю каля 6 км у 10 гадоў. Прырода паўночнага паўшар'я «вандруе» на поўнач і зьмяняе свае звычкі — раней расьцьвітаюць расьліны, зьвяры вясною раней адкрываюць шлюбны сэзон.**

Чырвоная вавёрка жыве ў Паўночнай Амэрыцы паўсюль — ад Аляскі на захадзе да Апалачаў на ўсходзе. Гэта першая жывёліна, у паводзінах якой адбыліся зьмены, генэтычна зьвязаныя з прыстасаваньнем да цяплейшага клімату. Усяго за дзесяць гадоў чырвоныя вавёркі з паўднёвага Юкону на 18 дзён прысьпешылі пачатак шлюбных гульняў. Паўзьдзейнічалі на гэта раньнія і цёплыя вёсны і вялікая колькасьць ежы ў той час. Зьмены ў звычках грызуноў зрабіліся настолькі трывалымі, што запісаліся ў ДНК. Зьдзіўляе хуткасьць, зь якой вавёркі прыстасавалі свае ДНК да клімату.

Да пацяпленьня адаптуюцца і эўрапейскія зьвяры ды расьліны. Да раньняй вясны спрабуюць прыстасавацца сініцы. Раней некаторыя папуляцыі гэтых птушак пасьпявалі за лета двойчы выгадаваць птушанятаў. Але цяпер другая кладка яек робіцца вялікай рэдкасьцю. Бо ў выніку пацяпленьня вусені — галоўны харч сініцаў — пачалі раней ператварацца ў матылёў. Вось птушкі й скарачаюць колькасьць кладак да адной. Таксама яны вымушаныя раней сядаць на яйкі, каб пасьпець выкарміць птушанятаў, пакуль далікатэс не разьляцеўся. Пацяпленьне ставіць эўрапейскіх птушак перад выбарам: міграваць на поўнач і захаваць свае даўнія звычкі ці застацца на месцы, прыстасоўваючыся да прыродных зьменаў.

Ды што далёка хадзіць па прыклады. Яшчэ з дзьвацаць гадоў таму такая расьліна, як цыкорыя, сустракалася толькі на поўдні Беларусі. Сёньня яе каляныя сьцяблінЫ, упрыгожаныя блакітнымі кветачкамі, можна спаткаць і на менскіх газонах.

Навукоўцы з Тэхсанскага ўнівэрсытэту ў горадзе Остын (ЗША) прааналізавалі 460 відаў расьлінаў і жывёлаў. Зь іх 81% зьмянілі месца свайго пражываньня менавіта пад уплывам клімату. Паводле гэтых зьвестак, кліматычныя зоны нашага паўшар'я перасоўваюцца на поўнач зь сярэдняй хуткасьцю 6 км за 10 гадоў. Флёра й фаўна раней абуджаюцца да жыцьця, і вясна кожнае дзесяцігодзьдзе пачынаецца на два дні раней. Дасьледнікі ж з Стэнфардзкага ўнівэрсытэту (ЗША) кажуць, што гэты тэмп значна большы, што кожнае дзесяцігодзьдзе вясна надыходзіць раней на пяць дзён.

І тэксанцаў, і стэнфардцаў найбольш непакоіць тое, што зямная прырода такая даткліваЯ — болесна рэагуе нават на невялікія кліматычныя зьмены. Як жа будзе выглядаць сьвет расьлінаў і жывёлаў праз сто гадоў, калі, як сьцьвярджаюць шматлікія прагнозы, на Зямлі пацяплее на 2—4 градусы?

Ёсьць небясьпека, што некаторыя віды расьлінаў і жывёлаў не перажывуць таго кліматычнага віражу, да якога мы гэтак хутка набліжаемся.



## Залевы і сухата

Затое падводная, вадаплаўная і, як ні парадаксальна, пустынная флёра й фаўна атрымліваюць карт-блянш. Як сьцьвярджаюць дацкія навукоўцы-кліматолягі, з кожным дзесяцігодзьдзем будзе расьці рызыка вялікіх летніх ліўняў ды гэткіх самых раптоўных засухаў.

Вялікія ліўні адбываюцца з прычыны пацяпленьня паветра. Чым яно цяплейшае, тым больш можа зьмясьціць у сабе акіянскіх выпарэньняў ды пасьля пераносьці на кантынэнт. У большай частцы Эўропы ўзрастае рызыка паводак.

Кліматолягі з Дацкага мэтэаралягічнага інстытуту першымі заняліся праблемай летніх дажджоў, што ўжо некалькі гадоў заліваюць Эўропу й выклікаюць трывогу ня толькі ў навукоўцаў. Датчане стварылі ўласную кліматычную мадэль «Гіргам-4» — кампутарную праграму, што можа вылічыць, як глябальнае пацяпленьне зьменіць колькасьць атмасфэрных ападкаў у Цэнтральнай Эўропе.

Навальніцы, якія прарокуюць дацкія навукоўцы, будуць трываць ад аднаго дня да пяці, але — што парадаксальна — агульная сума ападкаў зь ліпеня па верасень застанецца на сёньняшнім узроўні. Што гэта значыць? А тое, што трэба паволі разьвітвацца з лагоднымі летнімі дожджыкамі. Нас чакаюць залевы й засуха. Надвор'е будзе кідацца з адной крайнасьці ў другую.

# Сьвет праз 50 гадоў

**Праз 50 гадоў насельніцтва Зямлі павялічыцца амаль у паўтара разу — зь цяперашніх 6 млрд. да няцэлых дзевяці. Але ва ўсходнеэўрапейскіх краінах насельніцтва скароціцца на траціну, а сям-там і напалову, зазначаюць у сваім новым дасьледаваньні спэцыялісты ААН.**

Асабліва абязьлюдзее Эстонія. Гэтая краіна мае адзін з самых нізкіх паказьнікаў нараджальнасьці ў сьвеце. Праз 50 гадоў замест цяперашніх мільёна чатырохсот тысячаў там застанецца хіба 700 тыс. эстонцаў. Прыблізна такая самая доля чакае, на думку экспэртаў Аддзелу народанасельніцтва ААН, і Латвію з Украінай, якія таксама зьяўляюцца сусьветнымі лідэрамі па стратах насельніцтва. Да 2050 г. застанецца толькі мільён трыста тысячаў латышоў (сёньня іх каля двух з паловай мільёнаў) і няпоўныя 32 млн. украінцаў (сёньня іх 50 млн.). Апрача згаданых краінаў у самай гары сумнага рэестру фігуруюць Баўгарыя, Грузія, Расея, Літва, Армэнія. Тэмпы скарачэньня насельніцтва ў Беларусі не такія імклівыя, яе ў сьпіс не занесьлі.

Скарачэньне насельніцтва ў названых краінах зьвязанае перш за ўсё зь нізкай нараджальнасьцю. Кіраўнік Аддзелу народанасельніцтва ААН Жазэф Шамі тлумачыць: «Толькі тры чыньнікі ўплываюць на колькасьць насельніцтва: нараджальнасьць, сьмяротнасьць і міграцыя. Усе тры сёньня працуюць супраць Усходняй Эўропы. Тэмпы нараджальнасьці там — адны з найніжэйшых у сьвеце. Пазыкнікі сьмяротнасьці й працягласьці жыцьця не паляпшаюцца, як у Заходняй Эўропе. Яны альбо застаюцца на ранейшым узроўні, альбо пагаршаюцца. Не спыняецца й эміграцыя з такіх краінаў, як Расея і Ўкраіна, на Захад».

Цікава, як праз 50 гадоў будзе выглядаць сьпіс найбольш населеных краінаў сьвету. На першых месцах будуць Індыя і Кітай. Далей ідуць ЗША, дзе насельніцтва расьце ня столькі за кошт нараджальнасьці, але дзякуючы ўсё новым і новым імігрантам. Штогод у ЗША прыяжджае больш за мільён чалавек. Праз паўстагодзьдзя там будзе жыць больш за 400 млн. чалавек.

Расея ж, што яшчэ ў 50-я г. XX ст., нават бязь іншых савецкіх рэспублікаў, была чацьвертай па колькасьці насельніцтва дзяржавай у сьвеце, праз 50 гадоў апусьціцца на 18-е месца. А далёка перад ёй, апроч ужо згаданых лідэраў, апынуцца ня толькі Інданэзія і Бразылія, але й Пакістан, Мэксыка, Эгіпэт і нават Віетнам.

Хоць Расея з пункту гледжаньня працэнтнага скарачэньня насельніцтва знаходзіцца ў сьвеце на сёмым месцы, у абсалютных лічбах яе страты будуць найбольшымі. Праз 50 гадоў насельніцтва Расеі зьменшыцца на 44 мільёны, альбо на 30%. Такі прагноз, на думку Лязы Кекіча, аналітыка брытанскай кампаніі «Economist Intelligence Unit», дае падставы ставіць пытаньне, ці зможа Расея захаваць свае цяперашнія межы.

Праўда, усе гэтыя дасьледаваньні ня ўлічваюць аднаго: будучыня непрадказальная, а колькасьць насельніцтва нейкае краіны, дасягнуўшы пэўнага пункту неданасычэньня ці перанасычэньня X, можа пачаць расьці ці зьмяншацца таксама хутка, як падала ці павялічвалася.

# Павуціньне ў мікраскопах

**Навуковец з Каліфарнійскага ўнівэрсытэту Юшан Ян вырашыў галоўную праблему фатонікі — як зрабіць аптычныя валокны дастаткова тонкімі, каб перадаваць па іх прамяні сьвятла ў найхутчэйшых аптычных мікрасхемах. Дапамог яму гіганцкі мадагаскарскі павук.**



Навукоўцы ўзялі нітку павуціньня даўжынёй 1 см у гіганцкага павука Nephila madagascariensis, абгарнулі яе ў тэтраэтыл артасілікату і нагрэлі да тэмпэратуры 420°C. Пад узьдзеяньнем гарачыні валакно зрабілася танчэйшым у пяць разоў — да 1 мікрамэтра ў дыямэтры.

Наступным крокам будзе вытворчасьць яшчэ танчэйшых валокнаў з выкарыстаньнем павуціньня дыямэтрам 10 нанамэтраў. Таўшчыня валокнаў складзе каля 2 нанамэтраў — гэта ў 50 тыс. разоў танчэй за волас. Традыцыйныя мэтады дазваляюць дасягнуць дыямэтру толькі 25 нанамэтраў.

Валокны гэтыя могуць выкарыстоўвацца і для павелічэньня рэзалюцыі аптычных мікраскопаў — біёлягі змогуць вывучыць рэчы, меншыя за даўжыню сьветлавой хвалі, не выкарыстоўваючы электронных мікраскопаў і, такім чынам, не псуючы прадмету вывучэньня. Прыдадуцца валокны і ў сэнсарах новага пакаленьня — як звыштонкія тэставыя трубкі, здольныя «засмоктваць» адзінкавыя малекулы пэўнага хімічнага элемэнту. Гэта дасьць штуршок «супрамалекулярнай» хіміі — яна вывучае рэчывы, што ўзаемадзейнічаюць на вельмі малой прасторы.

**Падрыхтавалі МХ, Ян Мацур, Сяргей Радштэйн з выкарастаньнем матэрыялаў «Nature», «Gazety Wyborczej», «New Scientist»**

# Скокаўскі Рахвал

**На прыкметным узвышшы між вёскамі Скокі і Матыкалы ў ваколіцах Берасьця стаіць цагляная калёна. Яна даўно інтрыгавала людзей дапытлівых. Краязнаўца Л.Несьцярчук у сваёй працы «Замкі, палацы, паркі Берасьцейшчыны X—XX ст.» назваў калёну старадаўнім помнікам-вежай XVIII ст., але не ўдакладніў яе гістарычнага прызначэньня.**

Першую спробу вызначыць, для чаго ўзьведзеная калёна ля Скокаў, зрабіў берасьцейскі журналіст Юрась Рубашэўскі. Яго меркаваньне: калёну маглі ўзьвесьці ў гонар Канстытуцыі 1791 г., да якой меў простае дачыненьне сын уладальніка Скокаў Юльян Урсын-Нямцэвіч, пісьменьнік і гісторык, ад'ютант і сакратар Тадэвуша Касьцюшкі. Але аўтар не падае пісьмовых крыніцаў, каб пацьвердзіць гэтую думку. Дый Рэч Паспалітая хутка пасьля 1791 г. перастала існаваць. «Сьвежы» Канстытуцыйны слуп ня мог не супярэчыць палітыцы Расеі і меў малы шанец устаяць. Цагляная калёна была ўзьведзеная раней і зь іншай нагоды. Але зьвязаная яна менавіта зь імем Юльяна Ўрсын-Нямцэвіча.

Пад Берасьцем Нямцэвічы, вядомыя з XV ст., зьявіліся ў другой палове XVII ст. Віцебскі стольнік Андрэй Нямцэвіч робіцца ўладальнікам вёсак Нэплі, што на Бузе, і Клейнікі на рацэ Лясной — прытоку Бугу. Яго сын Аляксандар, мечнік Берасьцейскага ваяводзтва, далучыў да ўладаньняў Скокі, якія і дасталіся ў спадчыну Марцэлю, бацьку Юльяна Ўрсын-Нямцэвіча.

«Марцэль, падчашы Мельніцкі, быў для свайго часу выдатным асьвечаным шляхціцам, меў вялікі інтарэс да справаў дзяржавы і гісторыі краю. Вёў пошукі ў старых архівах і нават перапісваў гісторыю свайго ваяводзтва», — адзначае ва ўспамінах «Маім унукам» Станіслаў, апошні зь Нямцэвічаў уладар Скокаў. Як сьцьвярджае Станіслаў Нямцэвіч, менавіта Марцэль «пабудаваў каля 1770 г. Скокаўскі палац і завяршыў будаўніцтва касьцёлу ў 1796 г. Атрыманы ў спадчыну ад бацькі скокаўскі дворык зь лістоўніцы, у якім нарадзіўся Юльян, знаходзіўся зусім у другім месцы, непадалёку ад існай цяпер чыгункі, каля гасьцінцу, што вядзе да гміны Матыкалы, і прымыкаў таксама да старога дубовага лесу. Частку таго апошняга Марцэль перарабіў на парк. Ён таксама паставіў на высокай калёне статую сьвятога Рафаіла, якая стаяла непадалёк ад дворыка і ад якой да апошняга часу засталася калёна бяз статуі…»



Цагляная калёна Рафаіла каля Скокаў і месца, дзе стаяў драўляны дом Нямцэвічаў. Здымак аўтара.

Кожны, хто бывае у ваколіцах Скокаў, заўважаў на ўзвышшы паміж Скокамі і Матыкаламі тую цагляную калёну вышынёй мэтраў каля сямі. Два гады таму яна была адрамантаваная мясцовай уладай. Мясьціна, дзе яна стаіць, мае гістарычна-ўстойлівае імя, якое моцна б'е па слыху сваім нязвыклым гучаньнем — Рахвал.

Той, хто нарадзіўся і вырас у нашых мясьцінах, добра ведае, што ў мясцовых дыялектах гук «ф» часта вымаўляюць як «хв», адсюль не Рафал, а Рахвал. Такім чынам, кола замкнулася: цагляная калёна, на якую Марцэль узьнёс сьвятога Рафаіла каля 250 гадоў назад, дала гістарычную назву мясцовасьці, і яна, гэтая калёна, захавалася да сёньняшняга часу. І менавіта тут, непадалёку ад калёны Рафаіла, якая ацалела да нашага часу ў даўно зьмененай мясцовасьці, у сьціплым будынку нарадзіўся і вырас Юльян Урсын-Нямцэвіч.



**Фрагмэнт трохстворкавага складзеня з вобразам арханёла Рафаіла. Тураў, Усясьвяцкая царква, 1760 г. Беларуская школа. Мастацкі музэй.**

Цяжка сказаць, што дапамагло гэтай калёне выстаяць, але скідаць з разьліку яе «сьвятасьць» ня будзем. Рахвал, ці Рафаіл, — гэта адзін зь сямі арханёлаў. У некананічнай кнізе Товіта ён выступае ў ролі анёла-гойніка, якога паслаў Бог, каб вярнуць Товіту зрок і ўратаваць ад злых духаў дзяўчыну, прызначаную ў жонкі яго сыну. Рафаіл зь іншымі арханёламі вучыць Ноя распазнаваць зёлкі, перадае Адаму кнігі таемных ведаў. Марцэль невыпадкова ўзьнёс на цагляную калёну менавіта Рафаіла. Марцэлева жонка Ядзьвіга з Сухадольскіх нарадзіла пятнаццацера дзяцей, і толькі палова зь іх выжыла. Зварот бацькі да Рафаіла добра зразумелы.

**Анатоль Гладышчук, Скокі**

Анатоль Гладышчук — кандыдат фізыка-матэматычных навук, дацэнт Берасьцейскага політэхнічнага ўнівэрсытэту, краязнаўца, турыст.

# Спадкаемца старажытнага Друцку

Каб пабачыць Талачын ад самага пачатку, выходзіць зь цягніка трэба не на аднайменнай станцыі, а на чыгуначным прыпынку «Чырвоная Горка». Адтуль трапляеш у Стары Талачын, звычайную ўсходнебеларускую вёску з гіганцкімі ліпамі ўздоўж вуліцы. На гарадзкой ускраіне перад вачыма ўзьнікаюць маляўнічыя і велічныя будынкі былой гаспадаркі Юзафа і Тадэвуша Славінскіх.

Сёньня ў іхнай сядзібе месьціцца Талачынскі кансэрвавы завод. Дырэктар, Анатоль Анюхоўскі, раней кіраваў усёй раённай «вэртыкальлю», але ў лютым 2002 г. быў пасунуты з пасады на карысьць Аляксандра Марэйкі, выгадаванага ў шэрагах «вэртыкалі» верхнядзьвінскай. Тая рыхтуе кадры для Віцебшчыны, як магілёўская — для ўсёй краіны. На заводзе зь яблыкаў выrабляецца «пладова-выгаднае» віно. Уражваюць паэтычныя назвы гатункаў: «Сьвітанак», «Спадчына». Мясцовая газэта нeяк тлумачыла, што ад такога напою адбываецца «спад чыну» — страта чалавечага званьня. Вынікам папулярнасьці «чарніла» можна лічыць тое, што ў горадзе наноў пачаў працаваць мэдвыцьвярэзьнік, які ўжо быў зачыніўся. Зрэшты, калі б не завод, невядома, ці захаваліся б будынкі — помнікі прамысловай архітэктуры, не пазначаныя ані ў якім ахоўным сьпісе.




**На Талачынскім кансэрвавым заводзе правяраюць якасьць прадукцыі.**

Але самы значны архітэктурны помнік Талачына — колішняя ўніяцкая, а цяпер праваслаўная Сьвята-Пакроўская царква ў стылі «віленскага барока». Яна не зачынялася нават за савецкім часам. А касьцёл Сьв.Антонія толькі ў 1988 г. быў ізноў аддадзены вернікам. Мастак Алесь Пушкін стварыў для яго эскізы новых абразоў і вітражоў, але празь недахоп сродкаў яны дагэтуль існуюць у выглядзе праектаў.

На Талачыншчыне знаходзіцца гарадзішча старажытнага Друцку. Некаторыя эпізоды яго гісторыі ўражваюць сваёй гатычнай спэцыфікай. Паводле летапісу, у 1092 г. у наваколлі з магілаў павыходзілі нябожчыкі й рушылі на горад...

Пасьля сьвяткаваньня тысячагодзьдзя Друцку ў Талачыне засталіся шматлікія «трафэі»: забытыя жоўтыя бочкі ад квасу, «юбілейныя» сьметніцы ў выглядзе кветак-званочкаў. Зацьверджаны летась герб Талачына мае за аснову герб «Друцак», што належаў славутаму роду Друцкіх. Жыве тут і адзіная на ўвесь край прадстаўніца гэтага роду, пра якую кажуць: «Тая княгіня цяпер кароў доіць».

Яшчэ на Талачыншчыне нарадзіліся пісьменьнік Міхась Зарэцкі, аўтарка словаў да песьняроўскіх «Ручнікоў» Вера Вярба, драматург Алесь Петрашкевіч, мастакі Міхась Савіцкі ды Лявон Баразна. Ахвяра палітычнага забойства (па вэрсіі З.Пазьняка) Баразна пахаваны ў Талачыне. Недалёка ад ягонай ёсць магілы Сяргея і Стэфаніі Зотавых. Надпісы на памятках зробленыя па-беларуску, маюцца й вершаваныя эпітафіі:

«Век дужа кароткі
Пад сонейкам ясным,
Ды памяць аб продках
Ніколі ня згасьне».

«Маўклівыя сховы,
Ды ў пошуме дрэў —
І бацькава слова,
І матчын напеў».

**Міхал Чарвінскі**

# Атаман Хмара



КАЛЯЖ АНДРЭЯ ЧЫКА

**Атаман беларускіх партызанаў Вячаслаў Разумовіч сярод расейскай эміграцыі пачуваўся, як белая варона. «Хто ты — манархіст, легітыміст, сацыяліст, камуніст, сэпаратыст або проста авантурыст?» — пыталіся ў яго з розных бакоў. І на пытаньні гэтыя ён ня ведаў адказу. Яшчэ нядаўна ён кіраваў антыпольскай партызанкай, пасьля зьдзейсьніў таямнічы бізнэсовы праект, атрымаўшы грошы, так і не паставіў 100 тонаў сала літоўскаму войску...**

Травень 1924 г. Капітан Разумовіч прыплыў у вольны горад Данцыг раніцай. Там яго меўся чакаць пасярэднік, які браўся прадаць у Горадні Разумовічаў дом. Спадар Галін, ковенскі журналіст і сусед па каюце, які ведаў нямецкую мову, узяўся дапамагчы Разумовічу ў ягоных данцыгскіх справах. Завёў на нейкую вуліцу, пасадзіў на лаўку і сказаў пачакаць. Галіну, маўляў, трэ было на хвілінку зайсьці ў нямецкі кансулят па візу да Кёнігсбэргу. Сядзеньне на лаўцы пачало нудзіць капітана, сонца стаяла ўжо даволі высока. Недзе гадзіньнік на вежы прабіў дванаццаць разоў. Разумовіч ад учарашняга вечару нічога ня еў. Каб крыху разьмяць ногі, ён падышоў да пад'езду, у якім пару гадзінаў таму зьнік Галін. Прачытаў шыльду, і ногі зрабіліся ватныя: «Генэральны кансулят Польскай Рэспублікі».

* * *

Яшчэ ўвосень 1922 г. у Варшаве ўрадавы орган «Rzeczpospolita» ў вялікім рэдакцыйным артыкуле абвясьціў усяму сьвету, што на ўсходніх межах Польшчы стаяць беларускія паўстанцы. А кіруюць імі былы царскі афіцэр, а цяпер старшы лейтэнант літоўскага войска Разумовіч (псэўданім «Хмара») ды беларускі прэм'ер Ластоўскі. Маўляў, Нямеччына і Савецкая Расея, згодна з патаемнай дамовай, далі ім шматмільённы крэдыт і зброю на зьнішчэньне незалежнай Польшчы, культурнага бастыёну на ўзьмежжы Эўропы і Азіі. Вячаслаў Разумовіч быў абвешчаны ворагам Польскай Рэспублікі №1.

Урэшце Галін вярнуўся. Ён завёў Разумовіча ў Сопат, пасяліў у танны пансіянат і накарміў абедам. Назаўтра выявілася, што гарадзенскі купец не дачакаў. Празь дзень зьехаў і сам Галін, паабяцаўшы знайсьці і прывезьці таго купца. А праз два тыдні пасьля ад'езду Галіна ў дзьверы Разумовіча пагрукаўся маленькі худзенькі элегантны панок і пацікавіўся, ці ня ён спадар Разумовіч, які прадае ў Горадні дом.

Панок ня стаў хавацца і неўзабаве заявіў: «Я ведаю, што Вы — атаман Хмара. Мяне паслаў генэральны штаб з прыязнай прапановай, тым больш што нам пра вас усё вядома. Прапануем вам паступіць на службу ў польскае войска».

* * *

Разумовічу не было з чаго выбіраць. У Данцыг зь Літвы яго выпусьцілі толькі пад умовай, што ён ня вернецца назад. За чатыры гады пасьпеў нарабіць гэтай краіне столькі праблем, што яна была радая любым чынам ад яго пазбавіцца. З паручнікам Алейнічакоўскім — гэтак звалі госьця — яны пайшлі ў рэстаран, дзе добра паелі і выпілі зь дзясятак разоў за здароўе маршалка Пілсудзкага. Увечары яны ўжо разыходзіліся як старыя сябры, прычым паручнік адыходзіў без капелюша і хістаўся, як капітан карабля падчас буры.

Празь некалькі дзён з Варшавы прыехала падмацаваньне ў асобе паручніка Зацьвіліхоўскага, і Разумовічу была патлумачаная ягоная задача — паехаць у Прагу, дзе на той час знаходзіліся кіраўнікі Беларускай Народнай Рэспублікі, і падрыхтаваць глебу для паразуменьня іх з польскімі ўладамі.

Тым часам прыехаў гарадзенскі купец нерухомасьці і выкупіў Разумовічаў дом за бясцэнак — за нейкія дзьве з паловай тысячы даляраў. Да канца жніўня былі вырашаныя ўсе тактычныя пытаньні, атрыманая чэская віза, і 3 верасьня капітан Разумовіч выехаў у Прагу.

* * *

Праскія беларусы сустрэлі яго насьцярожана. Яшчэ не забыліся часы ягонага атаманства ў лясах Белавежы, калі Разумовіча абвінавачвалі ў шпіёнстве на карысьць адразу некалькіх варожых між сабою дзяржаваў. Не забыліся і ягоныя таямнічыя бізнэсовыя праекты, накшталт паставак літоўскаму войску 100 тонаў сала. Прычым ні сала, ні грошай тое войска так і не пабачыла. У Празе Разумовіч пасяліўся ў гатэлі «Атлянтык», дзе і распачаліся сходы й кансультацыі з прадстаўнікамі БНР — прэзыдэнтам Рады Крачэўскім і прэм'ерам Цьвікевічам. Ад Вільні ўзяць удзел у перамовах прыехаў дэпутат польскага Сойму Браніслаў Тарашкевіч. Ад польскага ўраду меўся прыехаць у Прагу адмысловы дэлегат, аднак час ішоў, дэлегат усё ня ехаў, пакуль Тарашкевіч, страціўшы цярпеньне, не махнуў рукой і ня зьехаў назад у Вільню, назваўшы ўсю справу правакацыяй самога Разумовіча.

* * *

Якраз у тым самым часе — позьняй восеньню 1924-га — на паседжаньні Лігі Нацыяў у Жэнэве абмяркоўвалася пытаньне аб прыналежнасьці Вільні. Гэтая падзея і прымушала палякаў шукаць саюзьнікаў у асобе эміграцыі беларускіх палітыкаў, тым болей што ў складзе літоўскай дэлегацыі ў Жэнэву паехаў былы прэм'ер Вацлаў Ластоўскі. Праскае кіраўніцтва БНР зрэагавала на гэты факт вельмі нэрвова — у Жэнэву была пасланая тэлеграма, у якой цьвердзілася, што Ластоўскі пазбаўлены права прадстаўляць беларускі народ, а Літва ня мае права вырашаць віленскае пытаньне без удзелу беларусаў.

Выбухнуў скандал. Літоўскія ўлады назвалі ўчынак кіраўніцтва БНР здрадай. У беларуска-польскай нарадзе ў Празе зьнікла ўсялякая неабходнасьць. Абодва бакі — беларускі і літоўскі — адчулі, што ўся гэтая непрыемнасьць была недзе некім сплянаваная і справакаваная. У пошуках ахвярнага казла ўсе позіркі зноў скіраваліся на няўрымсьлівага капітана Разумовіча.

* * *

Цяпер у Празе Разумовічу не было асабліва куды падацца. Колішні атаман беларускіх партызанаў сярод расейскай эміграцыі пачуваўся як белая варона. «Хто ты — манархіст, легітыміст, сацыяліст, камуніст, сэпаратыст або проста авантурыст?» — пыталіся ў яго з розных бакоў. І на пытаньні гэтыя ён ня ведаў адказу. Зарыентавацца ў блытаніне палітычных, нацыянальных і матэрыяльных інтарэсаў яму было надзвычай цяжка, і ён зрабіў свой выбар адвольна: далучыўся да арганізацыі «Ўсеславянская еднасьць».

Вакол Разумовіча пачалі круціцца нейкія палкоўнікі, генэралы, вайсковыя і цывільныя асобы. Расейская эміграцыя зьбіралася склікаць у Парыжы ўсерасейскі эміграцыйны парлямэнт пад кіраўніцтвам вялікага князя Мікалая Мікалаевіча. З Разумовічам, як прадстаўніком беларусаў, скантактаваўся з Парыжу генэрал Куцепаў і запрасіў яго на сустрэчу.

Папярэднюю згоду на ўдзел ва ўсерасейскім парлямэнце даў прэзыдэнт Рады БНР Пятро Крачэўскі. Гэта выглядала як адзіная магчымасьць выхаду з палітычнага падпольля, у якое загналі самі сябе кіраўнікі БНР, пераехаўшы ў Прагу. Чэскія ўлады далі ім дазвол на ўезд з жорсткай умовай спыніць якую бы там ні было палітычную дзейнасьць і забаранілі ім нават згадваць БНР.

Аднак, пакуль Разумовіч дабраўся да Парыжу, адбылася справакаваная савецкімі спэцслужбамі Бэрлінская канфэрэнцыя, на якой абсалютная бальшыня міністраў ураду БНР абвясьціла аб самароспуску і прызнаньні савецкай Беларусі.

* * *

Перамовы з Куцепавым у Парыжы ні да чога не прывялі — Разумовіч ужо нікога не прэзэнтаваў. Расчараваны атаман Хмара сустракаецца ў Данцыгу зь іншым партызанскім вэтэранам — зеленадубаўскім атаманам Дзергачом-Адамовічам. Разам яны мяркуюць, як і за якія сродкі далей жыць.

Адамовіч нечакана расказвае пра невераґодны плян, ажыцьцяўленьне якога магло б надоўга вырашыць усе іх матэрыяльныя праблемы. «Трэба дамовіцца зь літоўцамі», — несподзявана заяўляе ён Разумовічу.

На пачатку сусьветнай вайны немцы амаль бяз бою захапілі ковенскую крэпасьць (казалі, што яе камэндант, генэрал Грыгаровіч, быў падкуплены). Расейскае войска было вымушанае пасьпешліва адступіць. У дзяржаўнай скарбонцы захоўвалася шмат грошай у золаце і каштоўных паперах. Усё гэтае багацьце не было часу эвакуяваць, таму за некалькі гадзінаў перад адступленьнем паперы спалілі, а золата схавалі. Пры гэтай апэрацыі былі прысутны Адамовіч, які служыў тады ў Ковенскай крэпасьці.

Пра золата ведалі ўсе — і немцы, і літоўцы. Аднак спробы яго знайсьці нічым ня скончыліся. Месца схованкі ведаў толькі адзін чалавек — Адамовіч. Ён склаў пісьмовую заяву літоўскім уладам, што ў выпадку дамоўленасьці гатовы паказаць, дзе схаванае золата. Заяву гэтую Разумовіч узяўся перадаць у надзейныя рукі.

Выехаўшы праз Рыгу ў Коўна, Разумовіч быў вымушаны спыніць выкананьне пляну, бо на літоўскай мяжы быў імгненна арыштаваны. А я вымушаны спыніць пераказ гэтай невераґоднай гісторыі, бо яна, на жаль, выходзіць далёка за межы невядомай БНР...

**Сяргей Шупа, радыё «Свабода»**

Славамір АДАМОВІЧ



## Прынцэсе Нарвэгіі Марце Луізе

Нашчадніца суровага бэрсэрка,
прыгожая звычайнай пекнатой,
прынцэса Марта бачыць у люстэрку,
што хутка стане мамай маладой.

Ня ў дыхавічнай плоці сьпее семя —
здаровая жанчына носіць плод,
каб нарадзіць агністае, як крэмень,
дзіця, што прывітае свой народ.

Ня бачыў я прынцэс такіх ніколі,
прынцэсу Марту бачу ўпершыню:
як быццам мама на вясеньнім полі
кідае зерне ў цёплую ральлю.

Ёсьць пекната сапраўдная, зямная,
Ёй непатрэбны пэрлаў танны бляск.
Такой я ўбачыў Марту і схіляю
свой горды лоб ніжэй, чым ватэрпас.



Лявон Вольскі

назіраньні

# Голас народу

Голас народу. Што гэта? Выразьнік масавае думкі, супольнае сьвядомасьці? Той чаканы адказ на балючыя пытаньні, што падымаецца зь нізоў і сягае да самых вышыняў? Насамрэч, ты ня ведаеш, што гэта. Хоць і быў колькі разоў сьведкам гучаньня голасу народу. Кожнага разу ён быў розны — інтанацыйна, пачуцьцёва…

Вось дзед з Заходняе Беларусі размаўляе пра жыцьцё. І ягоны старэчы надламаны голас раптам ператвараецца ў той самы голас народу. Вялося пра сымболіку. «І правільна, што вярнулі вяночак. А чаго? Вось быў вершнік на кані. Вершніку есьці трэба? Трэба. А каню? Таксама трэба. А на ежу патрэбныя грошы. Грошы гэтыя бяруць у нас з вамі. А вянку есьці ня трэба. Вісіць сабе й вісіць. Вось расейцы. Быў у іх вянок. Ну і хай быў бы сабе. Дык не. Узялі гарла. Дый ня простага, а зь дзьвюма галовамі. Адну трэба харчаваць і другую. Во яно як».

Доўга ты думаў, што хацеў гэтым сказаць голас народу. А потым зразумеў: ня трэба шукаць глыбінных падтэкстаў. Голас народу не раскрые табе ніякіх таямніцаў. Ён папросту гучыць. Агучвае розныя народныя думкі.

Вечаровы перапоўнены аўтобус. Людзі вяртаюцца з працы ў свае спальныя раёны. Адзін падпіты рабацяга распавядае свайму калегу пра жырандоль, што зрабіў во гэнымі во рукамі ў сябе ўдома. «І тады на рабоце с…іў пару дэталяў, да гэтае фіговіны прымайстрачыў тую круглую, узяў паставіў шайбу і замацаваў…» Усе гэтыя маніпуляцыі ён дэманструе сваімі закарэлымі ўзьнятымі над галавою рукамі. Зрэшты, апусьціць рукі ўжо немажліва, бо народу набілася столькі, што рабочага шчыльна сьціснулі курткі, кажухі й футры пасажыраў. І вось ён стаіць, рукі ўгору, і тут ззаду чуецца голас народу: «Гэй ты, зь люстрай! Выходзіш?»

Здымалі нейкае чарговае пераднавагоднее шоў. Ты браў у ім удзел — падыходзіў да народу зь мікрафонам і шампанскім, а людзі прамаўлялі тосты. Было гэта перад Палацам Рэспублікі, на плошчы. У працэсе здымкаў ты заўважыў, што сярод шпацырнікаў, якія выбраліся да ілюмінаванага нулявога кілямэтру, вельмі мала менчукоў. Прамаўляючы тосты, народ казаў: мы з Івацэвічаў, мы з Баранавічаў… Нават з Рэчыцы прыехалі. Тосты, у большасьці, былі стандартныя. І вось адна кабета гаворыць (і гэта быў голас народу): «А я хачу сказаць спасіба і пажадаць здароўя, шчасьця і доўгіх лет жызьні нашаму прэзыдэнту. І бальшое спасіба яму за мір ва ўсім мірэ». Потым, з падозраньнем паглядзеўшы на вашыя твары, дадала: «Толькі ж не выразайце гэта, глядзіце! А то ж вы, відаць, выражаце…»

Самае цікавае, што тэлевізійнікі й сапраўды прыбралі зь перадачы ейную шчырую, ад сэрца, прамову.

Вось ты з адным вядомым гітарыстам стаіш у чарзе (трэба нешта купіць на вечар). Чарга стаіць у краме. Крама — ля Дому афіцэраў. Падзеі разгортваюцца ў Бабруйску. Гэта — зіма. Побач — велізарны намёт, плястмасавыя столікі й крэслы. На намёце напісана «Вып'ем па чарачцы, зьямо па шкварачцы». Нягледзячы на мароз, там сядзіць вельмі шмат народу. Там жа круцяцца падлеткі ў пошуках хоць якогасьці заробку — за тое, што прыбраў, падаў, прынёс… І вось вы з тым гітарыстам стаіце ў чарзе. Падлеткі ўважліва вас разглядаюць, бо паводле бабруйскіх стандартаў вы выглядаеце досыць экзатычна. Потым адзін зь іх, пераўтвараючыся ў голас народу, пытаецца:

— Рабята, а вы, случайна, не «Лепрыконсы»?
— Не.
— А хто?
— «NRM».
— «NRM»? Не-е, гэтую групу мы ня слушаем. Эта ж беларускую мову нада вучыць.

Нейк даўно, пры Саветах, ты працаваў у аўтапарку аздабляльнікам. Побач з майстэрняй быў кабінэт спартовага арганізатара. Звалі спартоўца Лёнем. Ён любіў зайсьці да цябе, пагаварыць у джаз-бэндзе на бубнах, апавядаў табе розныя гісторыі пра жыцьцё джазістаў. Ці то раптам пераключаўся: «А ведаеш такі вершык: «Пятрусь Броўка піша лоўка…» Нейк на пачатку зімы Лёня зайшоў да цябе, зірнуў у сіняе зімовае акно майстэрні, паглядзеў на засьнежаныя дрэвы, на дым з комінаў і прамовіў голасам народу, нейк летуценна, сам сабе: «Зіма прыйшла. Цiск памяняўся. Цяпер піцца будзе зусім ня так, як летам».

Не перапмайцеся. Няма ніякага голасу народу. Народ гамоніць на розныя галасы, бо народ у нас розны — сьмешны, дасьціпны, падмануты, дурны, п'яны, вясёлы, філязофскі, адмарожаны, сьціплы, распрыгонены, інтэлігентны… Голас народу патрэбны адно палітыкам, каб даказаць нешта сьвету, ці краіне, ці таму ж самаму народу. Тады яны й займаюцца стварэньнем гэтага агульнага, гучнага й аднастайнага голасу. А ты не палітык. Ты не магнат. Значыцца, ты ёсьць часткаю народу, і твой голас у асабліва яскравыя, бліскучыя моманты тваёй жыцьця, ня гучны, не аднастайны, але своеасаблівы, можна лічыць таксама й ягоным голасам. Голасам народу.



IREX-PROMEDIA

ДОЎГАЕ І КАРОТКАЕ

# Зьмястоўнае слова «бляндынка»



* * *

Жыцьцё Казімера Лышчынскага, слыннага беларускага філёзафа-атэіста, складалася зь дзьвюх частак. Прычым першай часткай было ягонае зямное жыцьцё.

* * *

Дасьведчаныя спакусьнікі часьцей за ўсё абіраюць сабе ў спадарожніцы жыцьця цнатлівак. І справа ня толькі ў тым, што спакусьнік — чалавек, які можа шмат чаго зрабіць з жанчынай, — не дапускае думкі, што такое самае «шмат чаго» нехта раней рабіў зь яго жонкай. І справа ня толькі ў адвечнай мужчынскай празе першынства. Спакусьнік умее прымусіць жанчыну адгукацца на ягоныя дзеяньні, але ў тым, што гэты водгук шчыры, ён будзе ўпэўнены, толькі калі жанчына *відавочна* ня мела досьведу сэксуальнае хлусьні.

* * *

Дарэчы, розьніца паміж спакушальнікам і спакусьнікам: спакушальнік спакушае, спакусьнік спакусіў.

* * *

Вы калі-небудзь бачылі твары людзей, што равуць «Жыве Беларусь!» у закрытых памяшканьнях? Яны дзікія, нібы згаладнелыя. Нават у самых інтэлігентных барацьбітоў, ледзь толькі яны кашлянуць хвосткае «Жыве!» на дасягальных толькі ім высокіх нотах, позірк ламаецца з разумна-ўедлівага ў жывёльна-сквапны. Вокрык «Жыве!» — гэта як эякуляцыя ва ўмовах жывое чалавечае адзіноты, прабачце. Спустошаныя інтэлігенты апускаюць вочы і думаюць аб сваім. Вокрык матляецца між сьцен і, адскокваючы ад цьвёрдых паверхняў, рыкашэціць інтэлігентаў па тварах, пакідаючы на мяккіх шчоках ружовыя разводы. Сорам за ўласную дзікасьць душыць інтэлігента, ён перастае добра спаць па начох і ўрэшце памірае ад заражэньня крыві.

Зусім інакшы крык «Жыве Беларусь!» на сьвежым паветры. Гэта ўжо ня залп пісталетаў ля скроні, гэта песьня, выпушчаная з самага сэрца, гэта блакітная птушка — «Жыве!» выцягваецца ў доўгую звонкую струну, якая чульліва пульсуе, пераліваецца ўсімі магчымымі танальнасьцямі з кожнай новай глоткай. Вокрык забірае ў кожнага чалавека ня толькі сум і боль, але й спакой — хочацца ляцець сьледам за ім над зямлёй, некуды пад нябёсы, каб, можа, адтуль хоць пабачыць, дзе яна, халера дзяры, жыве, тая Беларусь, калі тут яна ніяк не жыве... Ня будзем больш пра сумнае.

* * *

Толькі на тарашкевіцы слова «бляндынка» гучыць зьмястоўна.

* * *

Разарвалася повязь часоў. У аптэцы перасталі прадаваць прэзэрватывы. Цяпер туды зусім ня ходзяць здаровыя людзі.

* * *

Пэўна, гэта ўжо тэзыс, што Беларусь і Ўкраіна прайшлі амаль аднолькавы гістарычны шлях. Лучнасьць лёсаў выяўляецца часам у самых нечаканых сфэрах жыцьця.

Едзем у цягніку Пецярбург—Сімфэропаль. Магілёўскі хлопчык разгаварыўся зь нейкім расейцам пра беларускую мову і нарэшце весела пытаецца: «А знаете, как по-белорусски Кащей Бессмертный?» — «Как?» — «Здыхлік Неўміручы!»

Едзем зь Сімфэропалю ў Гурзуф на тралейбусе. Разгаварыліся з маладзенькай хахлячкай з-пад Палтавы пра ўкраінскую мову, і нарэшце яна весела пытаецца: «А знаешь, как по-украински Кащей Бессмертный?» — «Как?» — «Чахлик Невмиручий!»

**Аляксей Бацюкоў, Магілёў**

ФЭЛЬЕТОН

# Дарагая Аляксандра Рыгораўна…

Разумныя галовы ў атачэньні прэзыдэнта працуюць, нібы кампутары. Пралічваюцца ўсе варыянты разьвіцьця падзей. І адбіраюць такія, якія забясьпечваюць захаваньне ўлады на працягу як мінімум 25 гадоў, а як максымум — пяцідзесяці. Таму што здароўе ў Гаранта Канстытуцыі — цьху-цьху-цьху — добрае, і ён цалкам можа дажыць і да 100 гадоў. А тут яшчэ посьпехі геннай інжынэрыі, розныя ствалowыя клеткі, перасадка органаў і г.д. Зусім рэальна, што будзе наш Аляксандар Рыгоравіч у добрым здароўі й у 2055 г. на радасьць бабулькам, якія цяпер яшчэ ў караценькіх сукенках бегаюць.

Але ж усякае можа быць. Злосьнікі пішуць пра юрыдычныя прычэпкі. Маўляў, больш за два тэрміны — гэта процізаконна, парушаецца канстытуцыя й г.д. На гэты выпадак разумныя галовы распрацавалі запасны плян. Як паведаміла нам надзейная крыніца ў адміністрацыі, калі галоўныя варыянты не спрацуюць, прэзыдэнту будзе зробленая апэрацыя па зьмене полу.

Кампутарныя прыкідкі паказваюць, што пані атрымаецца статная й пышнагрудая. Што тычыцца фрызуры, дык пасьля апэрацыі валасы могуць вырасьці. Лысіна ж найчасьцей утвараецца пры лішку мужчынскіх гармонаў. У найгоршым выпадку можна насіць парык.

Крыніца кажа, што спачатку Гарант сустрэў гэты варыянт у штыкі, а пасьля сказаў: «А што, цікава!» Ён зразумеў, што Аляксандра Рыгораўна можа на самых законных падставах абірацца прэзыдэнткай. Гэта як мінімум яшчэ два тэрміны.

Кіраўнікі блізкіх і далёкіх дзяржаваў будуць ставіцца да яе па-джэнтэльмэнску. Ніхто не дазволіць сабе з дамай брутальнасьці і брыдкіх намёкаў кшталту «Катлеты асобна — мухі асобна». Няхай называюць «жалезнай лэдзі» — гэта нават лашчыць самалюбства.

А як што пойдзе ня так — можна плюнуць на ўсё, выйсьці замуж за добрага чалавека і зьехаць куды-небудзь на Блакітны Бераг…

**Віцяблянін**



# 450 год Рэфармацыі на Беларусі

Міжнародная канфэрэнцыя

**«Рэфармацыя і сучаснасьць: хрысьціянская духоўнасьць, тэалёгія, культура»**

· Выступы багасловаў, гісторыкаў;
· Хрысьціянская харавая музыка XVI стагодзьдзя.

Канфэрэнцыя адбудзецца **5–6 красавіка.** Збор удзельнікаў 5 красавіка ад 9.30 да 10.00 ля Палацу вэтэранаў (Я.Купалы, 21). Запрашаем усіх, хто цікавіцца хрысьціянствам, гісторыяй Беларусі, станам сучаснага духоўнага жыцьця. Даведкі па тэл. 249–98–38.

## Курсы карэктараў

Запрашаем усіх, хто падаваў заяўкі на курсы карэктараў, на папярэдняе тэставаньне па беларускай мове, паводле вынікаў якога будзе фармавацца навучальная група. Тэставаньне адбудзецца па адрасе: вул. Казлова, 7—101 (трамваі 1, 3, 4, 6, 8, 10, аўтобус 19 да прыпынку «Праспэкт Скарыны», аўтобус 100 да прыпынку «Вул.Казлова» або мэтро «Плошча Перамогі») у пятніцу, 4 красавіка, а 18.30.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ДАПАМОГА

**Дзяўчыне** з складаным захворваньнем (міяпатыя) патрэбна 2000 эўра на каляску з электрапрывадам. Т.: (8-01592) 92-2-69

### ВІТАНЬНІ

**Найлепшага Влодака** віншуем з Народзінамі. Няхай твая зорачка сьвеціць ярка заўжды. Канюшыя Вялікага Княства Браслаўскага

**Каханага Влодака** віншую з Днём народзінаў! Сапраўды, вясна толькі пачынаецца! Надзейка

**Дарагі Франак!** З маленькім юбілеем! 5х3 — гэта цудоўна! Жадаем здароўя, бадзёрасьці і ў 5х20! Алена, Паўліна

**Віншую М.Маліноўскую** (mi madre cysmica), Ганку-партызанку, Янку-філёзафа, братку Ляксандзера, Тацянку й Юльку («нацыяналістак, какіх ішчо паіскаць»), Таню-«білінгвістку», а таксама ўсю сьвядомую частку ФМА з 25 Сакавіка. Паляшук-летуценьнік

### КАНТАКТЫ

**Граждану Скіргайлу** з нагоды канцэрту 25 Сакавіка: у мянтоў на пляцы Коласа больш шляхетнасьці, чым у Вас. Дзякуй, што адштурхнулі публіку ад паганства, шкада, што зганьбілі імя Літвы. Праваслаўныя энд кампанія

**«А тыя**, што спадзяюцца на Госпада, адновяцца ў сіле...» Ісая 40:31. Кожную нядзелю а 18-й у царкве «Ласка Божая», Гурскага, 48 — беларускамоўнае богаслужэньне

**ZBSB.org** — наведайце сайт Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына»

**Набуду** расейска-крыўскі слоўнік В.Ластоўскага. Панове, а мо хто параіць, дзе знайсьці электронную вэрсію? Т.: 247-19-71. Янка

**У Курапатах** рэгулярна ламаюць крыжы. Тыя, каму ня ўсё роўна, прыходзьце. Н.

**Слухай**, **Толік Купава**, ты дзе? Не хавайся. Міхась, твой сябар

**Пазнаёмлюся** зь дзяўчынай (пажадана прывабнай) нацыяналістычных перакананьняў. Уладальніку пашпарту KB0124155, 220140, Менск

### КВАТЭРА

**Маладая сям'я** (2 чал.) здыме 1-пакаёвую кватэру ў Серабранцы. Парадак і своечасовую аплату гарантуем. Т.: (8-0297) 76-09-65

### ПРАЦА

**Навучу дзетак** беларускай, ангельскай мове. Т.: 252-11-30, 238-80-17

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Астроўскі Р., Астроўскі В. Беларусь у X—XVI ст.:** Гістар. нарыс / Таварыства беларускай культуры ў Літве; Падрыхт. да друку Л.Мілаш. — Вільня, 2002. — 22 с.

Гістарычную працу старшыні Беларускай Цэнтральнай Рады Радаслава Астроўскага і ягонага сына Віктара саматугам выдалі беларусы Літвы. Нарыс можна назваць азбукай антыкаляніялізму: ён амаль увесь пабудаваны на абвяржэньні польскіх і расейскіх каляніяльных мітаў. Аўтары ставілі мэтай ня так лягічны й пасьлядоўны выклад падзеяў, як расстаноўку акцэнтаў і ацэнку значэньня тае ці іншае асобы ў гісторыі. Сваёй тэзыснасьцю, структураванасьцю праца нагадвае канспэкт лекцый.







**Барысевіч Ю. Alter Nemo**. — Менск: Логвінаў; Санкт-Пецярбург: Невский Простор, 2003. — 144 с.: іл.

Кніга філязофска-культуралягічных эсэ Юрася Барысевіча прысьвячаецца «ўсім, хто ўмее чытаць». Наклад 500 ас.

**Беларуская мова. Інтэрнэт і кампутар:** Матэрыялы «круглага стала» міжнар. сымпозыюму «Разнастайнасьць моваў і культураў у кантэксьце глябалізацыі». — Менск, 2002. — 68 с.

Зборнік уключае матэрыялы, прысьвечаныя выкарыстаньню беларускай мовы ў кампутарнай сфэры. Пытацца ў кнігароў ТБМ.

**Гістарычная брама:** Гіст.-краязн. часопіс. — 2003. — № 1(21)

«Чаму й як загінула Рэч Паспалітая?», «Хто яны, сапраўдныя аўтары «Аповесьці мінулых часоў»?», «Матэвуш Бутрымовіч — пераўтваральнік Палесься» й іншыя гісторыка-краязнаўчыя матэрыялы беларускіх, польскіх, украінскіх ды расейскіх аўтараў. У «Акадэмкнізе» часопіс каштуе 4000 руб.

**Кісьліцына Г. Blonde Attack.** — Менск: Логвінаў, 2003. — 144 с.: іл. — (Другі Фронт Мастацтваў; Б-ка «Бум-Бам-Літу»). Наклад 500 ас.

**Мархель У. Шлях да Беларусі** / НАН Беларусі; Ін-т літаратуры імя Я.Купалы. — 2-е выд., дапрац. — Менск: Беларуская навука, 2003. — 123 с.

Дасьледчык імкнуўся ўпісаць постаць Адама Міцкевіча ў беларускі літаратурны кантэкст, паказаць уплывы, зробленыя ім ды іншымі польскамоўнымі аўтарамі-беларусамі на станаўленьне ў XIX ст. нашае літаратуры. У шапіку, што ў будынку Акадэміі навук, кніга каштуе блізу 2000 руб.

**Do Unii Europiejskiej dla jakości życia = To the European Union for a Better Quality of Life** / Ogólnopolski Klub Miłośników Litwy. — Warszawa, 2003. — 152 s.

Гэты зборнік склалі матэрыялы міжнароднай канфэрэнцыі выпускнікоў ВНУ краінаў Сярэдняй ды Ўсходняй Эўропы. Удзел у мерапрыемстве ўзялі маладзёны з 38 дзяржаваў. Свой даклад «Беларусь як складнік эўрапейскай цывілізацыі» на канфэрэнцыі прадставіў Ігар Лялькоў.

**ABC: Adriatyk, Bałtyk, Morze Czarne.** — 2002. — № 1(9)

Стваральнікі выданьня ставяць за мэту спрыяць усебаковым кантактам паміж краінамі трохкутніку «Адрыятыка—Балтыка—Чорнае мора». Беларуская праблематыка ў гэтым нумары прэзэнтаваная артыкулам І.Хатаўнянскага «Беларуская сацыял-дэмакратыя — шмат шуму зь нічога».

**Тацяна Вабішчэвіч**

КОНКУРС «НН»

**Я працую настаўніцай пачатковых клясаў гімназіі №2 Пінску. Зь дзецьмі вучу такую спэктральную памятку:**

**Ч**ароўная **А**фрыканская **Ж**ырафа **З**ь **Б**егемотам **С**макавалі **Ф**інікі.

Знайшла яе ў часопісе «Пачатковая школа» за 1996 г. у распрацоўках курсу «Асновы моўнай культуры» Т.Шылько.

**Людміла Лаўрысюк, Пінск**

**Ч**ас **П**рымусіць/**А**будзіцца **Ж**ыць, **З**апраданцам **Б**еларусі **С**кажам: «**Ф**іць!»

**Пятро Макарэвіч, Ліда**

**Ч**ароўны **А**ловак/**П**эндзаль **Ж**абка **З**найшла — **Б**алота **С**талася **Ф**айным.

**Ч**арэшні **П**арэчкі/**А**грэст, **Ж**уравіны **З**ьбіралі **Б**арбарка, **С**тась і **Ф**аіна.

**Ч**аго **П**рынесьці/**А**днесьці **Ж**эўжыку **З**ьесьці? — **Б**ульбы, **С**ала, **Ф**асолі.

**Не падпісаныя**

**Ч**аму **П**асецца **Ж**яраў **З**а **Б**алотам? **С**пытай **Ф**ядота.

**В. Бука, Горадня**

# Вынікі конкурсу імя Натальлі Арсеньневай

**На пачатку 2003 г. РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар» абвясьціла Літаратурны конкурс імя Натальлі Арсеньневай.** Усяго ўдзел узялі 177 аўтараў. 25 сакавіка журы ў складзе М.Тычыны (старшыня), А.Дынька, Г.Кісьліцынай, М.Скоблы й А.Хадановіча пасьля доўгіх дэбатаў назвала імёны фіналістаў. Гэта Арашонак Арцём, Дзьмітрыеў Дзьмітры, Ванітка, Івашчанка Анатоль, Каленік Вольга, Колас Вольга, Курчанкова Крысьціна, Лабадзенка Глеб, Ласкутнікаў Павал, Любы Андрэй, Морт Вальжына, Нікулін Алег, Новікава Марыя, Поўх Ірына, Прылуцкі Сяргей, Сакалюк Дзьмітры, Трэнас Віка, Чубат Аляксей, Шастак Юлія, Шугала Валерыя.

1—4 траўня для фіналістаў ладзяцца сэмінар і майстар-клясы. Па выніках конкурсу плянуецца выдаць кнігу або зборнік пераможцаў.

«НН» дзякуе за падтрымку сп.Сяргею Дубаўцу (Вільня), Кірылу Насаеву (Менск).

# Конкурс малюнку «Зазірні ў неба»

Моладзевае грамадзкае аб'яднаньне «Хаўрус сяброў» аб'яўляе конкурс малюнку для дзяцей і падлеткаў «Зазірні ў неба». Ладзіцца ён у трох катэгорыях: да 6 гадоў; ад 7 да 11; ад 12 да 15.

На конкурс прымаюцца толькі творы, у якіх закранаецца тэма сьвята Ўваскрэсеньня Ісуса Хрыста:

— унебаўшэсьце Госпада, анёлы, птушкі;

— стол на Вялікдзень, прыгожы абрус, фарбаваныя яйкі, першыя кветкі, ежа, прыгатаваная бабуляй, сям'я за сталом (велікодны натюрморт);

— мая царква (касьцёл) на Вялікдзень, вербы з Пальмавай нядзелі, сьвятар і г.д.

Працы мусяць выконвацца ў фармаце А3 (42х30 см) у любой тэхніцы: гуаш, акварэль, аловак і інш.

Дасылайце свае малюнкі на адрас: пл. Незалежнасьці, касьцёл Сьв.Сымона і Алены, 220010, Менск, з пазнакай: «Конкурс малюнку «Зазірні ў неба», не пазьней за 15 красавіка.

Пераможцаў чакаюць прызы. Усе малюнкі ўтвораць выставу, што можна будзе аглядаць цягам двух тыдняў пасьля Вялікадня ў бібліятэцы Чырвонага касьцёлу. Тут жа 3 траўня а 15-й адбудзецца ўзнагароджаньне пераможцаў. Падрабязную інфармацыю пра конкурс Вы знойдзеце на нашым сайце: http://zmk.at.tut.by. Кантактны e-mail: zmk@tut.by.

Цягам месяца пасьля выставы аўтары змогуць забраць малюнкі.

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Сяргей Ёрш |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, (0296) 13-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3889.

Нумар падпісаны ў друк 2.04.2003.

Замова № 1788.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________